Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў)

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу (паштаводная) — 20 к. Месцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапкарамі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапкарамі наперад тэксту 1 р. — к. За радок шапкарамі перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі ня 50 проц. дазволены. Зьніж тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 25 к. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрадоўж. і чарговадарміцкія за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 57 (2546) Аўторак, 11-га сакавіка 1929 г.

Памылкі выбарчай кампаніі павінны быць выпраўлены.

МАСКВА, 9-III. Пленум Усерасейскай Цэнтральнай Выбарчай Камісіі заслухаў даклады прадстаўнікоў месц аб працы па складаньні сьпісаў пазбаўленых выбарчага права. У спрэчках выступіў тав. Сольц, які зазначыў на шэраг няправільнасьцяй пры складаньні сьпісаў. Селяніна, які служыў некалькі гадоў у Чырвонай арміі—апавядае тав. Сольц,—пазбавілі правоў за тое, што ён ня маючы ніякіх сродкаў да існаваньня, адзін ці два месяцы гандляваў. Усё тлумачыцца тым, што да пазбаўленьня выбарчых правоў выбарчыя камісіі падышлі фармальна. Які-ж гэта клясавы падыход,—гаворыць тав. Кісялёў,—калі па тых, ці іншых фармальных прычынах пазбаўляюць правоў сераднякоў, калі дзяцей пазбаўленых правоў выкідаюць з школ, ня гледзячы на тое, што гэта пастановамі ўраду забаронена. Няўжо мясцовыя камуністы не разумеюць, што такімі вынікамі яны падрываюць палітыку савецкае ўлады. Падыход-падыходам—а законы выконваць усе абавязаны. Інструкцыі вы атрымалі, трэба іх выкрываць». Адзначаючы грубае парушэньне выбарчага законадаўства, пленум прапанаваў Волскай і Саратаўскай выбарчым камісіям у тэрміновым парадку перагледзіць сьпісы пазбаўленых правоў. Пракурору рэспублікі даручана правесьці расьледваньне і віноватых у парушэньні выбарчага законадаўства прыцягнуць да адказнасьці.

І правы і левы ўхілы—варожыя партыі

(З прамовы т. Кірава на Ленінградзкай канфэрэнцыі).

ЛЕНІНГРАД. 10 сакавіка на ленінградзкай абласной партканфэрэнцыі з дакладам аб працы абласнога камітэту Усе КП(б) выступіў т. Кіраў. Кажучы аб антыпартыйных ухілах, т. Кіраў адзначыў, што ў Ленінградзкай арганізацыі ў гэтай адносіне ўсё добра.

— Мы ня можам,—сказаў т. Кіраў,—нядбайна адносіцца да прыміранцтва. Мы знаходзімся не перад часовым зьявішчам, а перад зьявішчам, якое будзе харчавацца нашымі цяжкасьцямі. Трэба весьці самую рашучую, самую суровую барацьбу за прынцыпы ленінізму. Я бы скончыў на гэтым свой даклад, калі-б ня было выступленьня т. Угарава. У т. Угарава на словах вышла так, што ён проці кулака, што ён за індустрыялізацыю. У чым-жа справа? Калі чалавек па-троху робіцца апартуністам, ён, вразумела, гэтым ганарыцца асабліва ня можа. Проста ўзяць ленінскую вопратку і апрануцца ў апартуністычную тогу ў нас у партыі ўдалося колькі аднаму Троцкаму. Звычайна пачынаюць з крытыкі ўнутры партыйнага рэжыму.

У абставінах шырока разгорнутае дэмакратыі і самакрытыкі гаварыць аб унутрыпартыйным зажыме, гэта значыць ня ведаць ні партыі, ні нашае працы. Я думаю, што паступілі зусім правільна, што павялі сыстэматычную растлумачваючую працу сярод шырокіх колаў членаў партыі. Гэта прывяло да таго, што за выключэньнем асобных адзінак наша арганізацыя бязумоўна здаровая. Тая вялізная ўнутрыпартыйная барацьба, якую правяла партыя з трацкістамі, увяла на новую ступень разьвіцьця нашу арганізацыю. Гэта дапамагло таму, што мы сустрэлі ўзброенымі правы ўхіл.

Я думаю, што наша партыя вырасла настолькі, што можа павярнуць касьцяк нашае партыі туды, ці сюды будзе няправільна. Гэта нікому ня ўдасца (воплескі). Мы скажам усім адказным прадстаўнікам, якія хварэюць правым ухілам: „Дарагія таварышы, мы бязьмежна вас паважаем. Мы ад вас вучымся; вы нас выхоўвайце, але мы больш, чымся ўсіх вас разам, паважаем тое, што павінуў нам Ленін—нашу вялікую камуністычную партыю ў целым. І кожнага з вас мы паставім перад партыяй на калены".

ПРАЭКТ АРГАНІЗАЦЫІ БАНКУ ПА РЭПАРАЦЫЯХ.

ПАРЫЖ, 10-III. Агэнцтва Гавас паведамляе: «Прапанаваны камісіі экспэртаў праэкт арганізацыі міжнароднага банку прадугледжвае паступовае скасаваньне часовых устаноў, зьбіраючых рэпарацыі, і замену іх сталымі ўстановамі мірнага часу. Банк будзе дзейнічаць як трэст, атрымліваючы штогадовыя ўзносы, затрымліваць іх у сябе, палягчаючы трансфэр і фінансуючы дастаўкі натураю. Банк будзе адыгрываць ролю пасрэдніка паміж урадамі і банкірамі, пры вырашэньні пытаньня аб разьмеркаваньні бон камэрцыялізаванага нямецкага банку. Камісія экспэртаў у працягу бліжэйшых пасяджэньняў вырашыць пытаньне аб прыняцьці або адхіленьні гэтага праэкту».

СКЛОКА ПАМІЖ ПОЛЬСКІМ СОЙМАМ І ЎРАДАМ ПРАЦЯГВАЕЦЦА.

ВАРШАВА, 9-3, Усеагульная ўвага згуртавана на ўнутранай палітыцы і асабліва на апошніх тэзісах ураду з соймам. У выніку барацьбы між соймам і ўрадам па пытаньні аб перавыдатку каля 600 міліёнаў злотых у 1927-28 бюджэтным годзе, з прычыны чаго пастановаю сойму перададзена ў бюджэтную камісію пытаньне аб прыцягненьні да адказнасьці перад канстытуцыйным трыбуналам міністра фінансаў Чэховіча, апошні пасьля бурнага пасяджэньня савету міністраў падаў у адстаўку. Да ўсеагульнага зьдзіўленьня палітычных колаў адстаўка Чэховіча прынята прэзыдэнтам. Кіраўніком справамі міністэрства назначан таварыш міністра фінансаў Гратынскі.

Адстаўка Чэховіча зрабіла вялікае ўражаньне.

КАМПАРТЫІ МАБІЛІЗУЮЦЬ РАБОЧЫЯ МАСЫ СУПРОЦЬ ВАЙНЫ.

ПАРЫЖ, 9-III. Агалошана адозва цэнтральных камітэтаў кампартый Францыі, Нямеччыны, Бэльгіі, Галяндыі і Англіі да рабочых гэтых краін з заклікам выступіць проці небясьпекі вайны і на абарону СССР.

Турэцкая прэса адобрае далучэньне Турцыі да маскоўскага пратаколу.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 8-III. Рэдактар газэты „Мілієт" Махмуд піша наконт далучэньня Турцыі да маскоўскага пратаколу так: «Далучэньне Турцыі да пратаколу зьяўляецца фактарам доказу савецка-турэцкае дружбы»

Нямецкая сацыял-дэмакратыя на службе контр-рэвалюцыі.

ВЫКРЫВАНЬНЕ ГАЗЭТ «РОТЭ ФАНЭ» І «ВЕЛЬТ АМ МОНТАГ»

Белагвардзеец Арлоў на службе ў нямецкага ўраду

БЭРЛІН, 9-2. Бэрлінскі паліцэй-прэзыдэнт агаласіў паведамленьне, у якім гаворыцца, што сьцьвярджэньні друку адносна дзейнасьці белагвардзейца Арлова ў якасьці агента бэрлінскай палітычнай паліцыі па справах нямецкіх камуністаў няправільныя. Падазрэньне ў тым, што Арлоў займаецца вырабам фальшывак, узьнікла ў бэрлінскай палітычнай паліцыі ў сярэдзіне мінулага году (!). Паліцыя была гатова прыняць меры проці Арлова якраз у той момант, калі ёй сталі вядомы весткі аб дзейнасьці Арлова.

«Ротэ Фанэ» зазначае, што апошняя частка паліцэйскага паведамленьня, якая датычыць завярэньняў друку аб тым, што паліцыя карысталася паслугамі Арлова ў якасьці даносчыка уяўляе сабою адкрытае прызнаньне паліцыі, бо яна не адважылася гэтага адхіліць. Паведамленьне паліцыі мае характар гутаркі супольніка. «Ротэ Фанэ» высоўвае наступныя запытаньні.

1) Ці верна, што 2-га верасьня 1921 г. стар. сэкратар Вэйцман зьвярнуўся да агульна-нямецкага ўраду з лістом, у якім прапанаваў заснаваць пры пасольстве у Маскве і ў консульстве ў Петраградзе сакрэтныя інфармацыйныя бюро.

2) Ці верна, што Вэйцман прапанаваў, каб у Маскве і ў Ленінградзе былі арганізаваны бюро шпіянажу ў якасьці сродкаў контр-рэвалюцыі, накіраваных проці савецкага ўраду;

3) Ці верна, што падначалены Вэйцмана, ведаўшы справамі дачыненьняў з савецкім урадам вядомы Бартэльс выкарыстаў Арлова ў якасьці шпіка.

4) Ці верна, што пасьля адстаўкі Бартэльса, Арлоў падтрымліваў шчыльную сувязь з чыноўнікам дзяржаўчага камісарыяту грамадзкага парадку і чыноўнікам бэрлінскае палітычнае паліцыі і што абодвы яны аказвалі Арлову падтрыманьне ва ўсіх адносінах.

Нямецкія ўстановы трымалі сувязь з белагвардзейцамі.

Яшчэ аб прыязьні паліцэй-прэзыдэнта да белагвардзейца Арлова.

БЭРЛІН, 9-3. «Вэльт Ам Абэнд» ня спыняе агалашаць весткі аб сувязі між удзельнікамі фабрыкацыі фальшывак і нямецкімі ўстановамі. Газэта сьцьвярджае, што Арлоў, у кожным выпадку не пазьней чымся з вясны 1925 г. зьяўляецца сталым госьцем палітычнага аддзяленьня бэрлінскага паліцэй-прэзыдыуму. У свой час ён дамогся падтрыманьня ў паліцэй-прэзыдыуму для працуючага ў бэрлінскай паліцыі ранейшага царскага афіцэра Гаральда Зібэрта. «Цяпер-жа—піша далей газэта—Зібэрт, які за свае «паслугі» атрымаў нямецкае грамадзянства, дзіўным чынам прыцягнут у якасьці экспэрта да расьсьледваньня справы Арлова, прычым яму даручана вывучэньне сьледчага матар'ялу. Нарэшце газэта паведамляе, што абаронца Арлова прапанаваў паліцыі ці перадаць справу Арлова пракуратуры, ці неадкладна-ж вызваліць яго, бо водлуг слоў абаронцы нельга пазбаўляць волі такога чалавека, як Арлоў, які аказаў нямецкай дзяржаве вялікія паслугі.

САКРЭТНЫ ЎГАВОР МІЖ ПОЛЬШЧАЙ І РУМЫНІЯЙ.

УГАВОР БЫЎ ПАДПІСАНЫ ПЕРШАГА КАСТРЫЧНІКА 1928 ГОДУ

Плян лягчэй складаць, чымся выконваць.

(ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ЛІТОЎСКАЙ ГАЗЭТЫ).

КОЎНЯ, 9-3. Ня спыняючы свае выкрываньні наконт тайнага польска-румынскага дагавору, накіраванага проці СССР і Літвы, афіцыёз „Летувос Айдас" паведамляе, што ДАГАВОР БЫЎ ПАДПІСАН 1-ГА КАСТРЫЧНІКА 1928 Г. ПОЛЬСКІМ ВАЙСКОВЫМ МІНІСТРАМ І НАЧАЛЬНІКАМ РУМЫНСКАГА ГЕНЭРАЛЬНАГА ШТАБУ Ў БУХАРЭСЬЦЕ. Адзначаючы потым, што ўгавор пацьвярджае ўсе чуткі аб імкненьні пілсудчыкаў адхапіць Украіну ад СССР, газэта падкрэсьлівае, што Польшча ці Румынія разьлічваюць на дапамогу іншых краін і піша: „ПЛЯН ЛЯГЧЭЙ СКЛАДАЦЬ, ЧЫМСЯ ВЫКОНВАЦЬ. ПЛЯН АДАРВАНЬНЯ УКРАІНЫ МОЖА БЫЦЬ НЯ КЕПСКІ ДЛЯ ПОЛЬШЧЫ, АЛЕ НЕ ХАПАЕ АДНАЕ НЕАБХОДНАЕ ЎМОВЫ, А МЕНАВІТА—ЖАДАНЬНЯ ЎСІХ УКРАІНЦАЎ". У канцы газэта піша: «Ніхто ня можа гарантаваць, што Пілсудзкі не пачне ажыцьцяўляць авантурыстычныя пляны. Таму, ня гледзячы на пакт Келёга і на маскоўскі пратакол, мір ва Усходняй Эўропе зьяўляецца незабясьпечаным, пакуль палітыкай будуць кіраваць авантурысты і, наогул, ня зьменіцца ўсё сучаснае становішча. Падпісваючы адзэй рукой маскоўскі пратакол, Польшча і Румынія другой рукой падпісвалі тайны дагавор у Бухарэсьце ў мэтах падпальваньня грандыёзнае вайны.

Дагавор заключан не без садзейнічаньня Англіі.

БЭРЛІН, 9-III. «Кельніше Цэйтунг», абмяркоўваючы агалошаны літоўскім афіцыёзам „Летувос Айдас" сакрэтны польска-румынскі вайсковы дагавор, піша: «Удзельнічаючыя ў дагаворы ўрады будуць, само сабою вразумела, як заўсёды ў такіх выпадках робяць, спрачацца за правільнасьць агалошаных газэтай даных. Ім ня ўдасца пераканаць сьвет, што гэты дагавор ня ёсьць плоць ад іх плоці. Усе даныя, агалошаныя ў ковенскай газэце, надзвычайна праўдападобны. Зусім бясспрэчна, што гэты сакрэтны дагавор адпавядае вядомым жаданьням Англіі ўтварыць уласны фронт навокал СССР з тым разьлікам, каб праз вайну дамагчыся распаду савецкае дзяржавы на яе складаныя часткі і, такім чынам, пазбавіць яе моцы.

Як Англія разбройваецца.

ЛЁНДАН, 9-3. Зазначаючы на нязначнае скарачэньне марскога бюджэту Англіі, „Таймс" у асьцярожнай форме выказвае жаль з прычыны таго, што магутнасьць ангельскага флёту паслабляецца. „Морнінг Пост" адкрыта пратэстуе проці эканоміі ўзброеньня новых суднаў. «Дэйлі Геральд» піша: „Праўда ў тым, што Англія ня прымае ніякіх рэальных крокаў да разброеньня. Уключаны ў чарговы бюджэт выдатак на ўзброеньні на 113 міліёнаў фунтаў стэрлінгаў перавышае ўсе выдаткі па асьвеце, пенсіях, аховае здароўя, кватэрнаму будаўніцтву і дапамогі беспрацоўным".

САВЕЦКІЯ ЛЁДАКОЛЫ ЗА МЕЖАМІ.

БЭРЛІН, 10-III. Прыбыўшы ў Кіль савецкі лёдакол «Ермак» рабочыя масы сустрэлі з энтузіязмам. Тысячы рабочых, не зважаючы на сьнег і лёд, пашлі вітаць савецкі лёдакол і савецкіх чырвонафлётдаў.

ЗА ЗБЛІЖЭНЬНЕ З СССР.

ПАРЫЖ, 10-3. Парыскія газэты паведамілі з Нью-Ёрку аб тым, што ў фінансавых колах Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў узьнят рух у карысьць назначэньня асобнае камісіі экспэртаў, якая павінна «вывучыць пытаньне аб расейскіх даўгох і выехаць у СССР для азнаямленьня на месцы з гандлёвым і прамысловым разьвіцьцём Савецкага Саюзу». Далей газэты сьцьвярджаюць быццам старшынёю гэтае камісіі намечан Оўэн Юнг.

БАРАЦЬБА Ў МЭКСЫЦЫ.

НЬЮ-ЁРК, 9-3. Як паведамляюць з Мэксыкі, паўстанцы занялі паўночны пагранічны горад Сіудад Хуарэс, (паўдзённы штат Амэрыкі). Урадавае войска адступіла ў Эль-Басе і там інтэрнавана. Гувэр забараніў вываз аэраплянаў у Мэксыку, за выключэньнем закупленых мэксыканскім урадам. Вайсковае міністэрства Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў дастаўляе мэксыканскаму ўраду вайсковую амуніцыю. Як паведамляюць, урад Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў мае намер дазволіць мэксыканскаму ўраду перавезьці свае войска праз тэрыторыю Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных штатаў для нападу на паўстанцаў з тылу. Мэксыканскі ўрад афіцыйна паведамляе, што яго ўлада ў Вэра-Круцы адноўлена. Паўстанцы заявяраць, што імі заняты буйнейшы італьянскі порт Мэксыкі Масаплан.

НА ПАКЛОН ДА ФАБРЫКАНТАЎ.

БЭРЛІН, 9-3. „Ротэ Фанэ" агалашае здымак ліста, у якім лідэр саюзу «рэспубліканскага сьцягу", сацыял-дэмакрат Хэрзінг зьвярнуўся да сотняў фабрыкантаў. Ліст уяўляе сабою зьвернутую да капіталістаў просьбу ахвяраваць для саюзу „рэспубліканскага сьцягу" у справе падтрыманьня бязпаснасьці і парадку і падкрэсьлівае, што саюз рэспубліканскага сьцягу бароніць грамадзкасьць ад небясьпекі з правага боку і левага. Хэрзінг лічыць асабліва неабходным перайсьці ў наступ супроць камуністаў і чырвоных франтавікоў". „Ротэ Фанэ" падкрэсьлівае, што дакумант адбівае разлажэньне сацыял-дэмакратычнае ўлады і патрабуе, каб дакумант падпісаў абмеркаваньню на кожным прадпрыёмстве.

РАТЫФІКАЦЫЯ МАСКОЎСКАГА ПРАТАКОЛУ.

РЭВЕЛЬ, 9-3. Эстонскі парлямант ухваліў у другім і трэцім чытаньні законапраэкт аб ратыфікацыі маскоўскага пратаколу.

НЯЎДАЧНАЯ СПРОБА.

ВАРШАВА, 7-3. Учора ў Львове сябры падпольнай украінскай арганізацыі ўчынілі няўдалую спробу экспрапрыяцыі скарбовых грошай. У зьвязку з гэтым здарэньнем паліцыя арыштавала 16 студэнтаў украінцаў, якія абвінавачаны ў прыналежнасьці да ўкраінскай вайсковай арганізацыі. Марытчак перадаецца паскораному суду, і яму пагражае пакараньне сьмерцю.

Забастоўка шофэраў у Парыжы.

ПАРЫЖ, 9-III. У Парыжы абвясьцілі забастоўку дзьве тысячы шофэраў таксаматораў 3-х райёнаў, патрабуючы падвышэньня зарплаты. Забастоўкаю кіруе унітарны прафсаюз шахцёраў.

Як гаміндананаўскія заправілы падрыхтоўваюць чарговы зьезд.

ДЭЛЕГАТЫ НАЗНАЧАЮЦЦА, А НЕ АБІРАЮЦЦА.

ПЭЙПІН, 9-III. Водлуг паведамленьня «Пэйпін-ішы-бао», камітэт хабэйскае правінцыяльнае арганізацыі Гаміндану падаў у адстаўку ў поўным складзе. У лісьце, накіраваным у выканком Гаміндану ў Нанкін, камітэт, матывуючы выхад у адстаўку, піша: «Хабэйскі камітэт склікаў правінцыяльную канфэрэнцыю Гаміндану для выбараў дэлегатаў на 3-ці зьезд Гаміндану. 270 дэлегатаў ужо прыехалі ў Пэйпін для ўдзелу ў работах канфэрэнцыі. Аднак ужо мінула звыш 20 дзён, тым ня менш з Нанкіну да гэтага часу не атрыманы ўказаньні, на які дзень назначыць выбары. Жыцьцё ці развал Гаміндану будзе вырашана на 3-м зьезьдзе Гаміндану. Аднак, 70 проц. усіх дэлегатаў не зьяўляюцца абраньнікамі, а назначаны цэнтрам і, вразумела, ці маюць нічога супольнага з мясцовымі партыйнымі арганізацыямі. Уся наша правінцыяльная арганізацыя нікога, яе ненавідзіць так горача і заядла, як Чан-чы, тым ня менш ён назначан дэлегатам на зьезд. Ван-Цьзю-Чан, які толькі надаўна яшчэ катаваў і забіваў членаў Гаміндану і іншых асоб у Пэйпіне, цяпер таксама зьяўляецца дэлегатам зьезду ад Мукдэну. Кроў нашых таварышоў яшчэ на высахла на руках гэтых асоб, але яны ўжо сталі дэлегатамі зьезду. Гэта азначае поўнае паражэньне справы Гаміндану, і нагэтаму мы ўсе ідзем у адстаўку».

Правал спробы ўцягнуць Злучаныя Штаты Амэрыкі ў „эўрапейскую сям'ю".

ЖЭНЕВА, 10-3. Камісія рады Лігі Нацый скончылася ўхвалою пастановы аб скліку канфэрэнцыі юрыстаў для вывучэньня ўмоў далучэньня Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў да міжнароднага трыбуналу. Падставай для абмеркаваньня гэтага пытаньня паслужыла нота ўраду Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, адрасаваная ўсім дзяржавам, удзельнічаўшым у трыбунале, у якой выказвалася надзея, што шляхам перамоў «між юрыдычнымі экспэртамі» можна знайсьці формулу, ажыцьцяўляемую адзіную ўмову, прад'яўленую Злучанымі Штатамі, а менавіта, што пытаньні, закранаючыя інтарэсы Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, могуць абмяркоўвацца трыбуналам толькі са згоды ўраду Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў. Жэнэўскія колы лічаць, што знайсьці такі кампраміс удасца толькі пасьля доўгіх перамоў, пры якіх Злучаныя Штаты дамогуцца на такім прызнаньня прынцыпу «няўмешваньня трыбуналу ў амэрыканскія справы», але і забясьпечыць сабе магчымасьць у кіраўнічай ролі пры вырашэньні трыбуналам спрэчак між эўрапейскімі дзяржавамі.

ШТО НЯВЫГАДНА АНГЛІІ, ТОЕ НЕПАТРЭБНА ЛІЗЕ НАЦЫЙ.

ЖЭНЕВА, 4-3. Рада Лігі Нацый выслухала гадовы даклад камісіі Лігі па справах мандатных тэрыторый. Даклад закранае пытаньні адносна англа-іракскіх адносін. У зьвязку з агалошэньнем гэтага дакладу, Чэмберлен зрабіў заяву, у якой зазначыў на непажаданасьць абмеркаваньня па сутнасьці цытаньня аб зьмесьце англа-іракскага дагавору, пакуль ня скончаны англа-іракскія перамовы аб перагляндзе ваеннае і фінансавае клёзы, якія зьяўляюцца дадаткам да самога дагавору 1922 году, і ад заключэньня якіх залежыць ратыфікацыя дагавору 1927 году. Рада без спрэчак прыняла заяву Чэмберлена да ведама.

НЯЎДАЧЫ НЯМЕЦКАГА ЎРАДУ Ў ЖЭНЕВЕ.

БЭРЛІН, 10-III. Пастанова рады Лігі Нацый па пытаньню аб арышце лідэра Фольксбунда (нямецкая партыя ў польскай часьці Верхняе Сілезіі) і члена нядаўна распушчанага верхнясілезкага сойму Улітца яшчэ пагоршыла ў нямецкіх грамадзян колах ураженьне аб няўдачы нямецкага выступленьня па пытаньні аб нацыянальных меншасьцях (рада Лігі Нацый здаволілася тым, што прыняла да ведама заяву польскага ўраду аб тым, што Улітц прыцягваецца да судовай адказнасьці па абвінавачаньню) ў садзейнічаньні дэзэртырам, а таму ўмешваньне Лігі Нацый у гэту справу немагчыма). «Дэйтшэ Альгемэйнэ Цэйтунг" піша: «Ліга Нацый, якая павінна фігураваць у якасьці месца згоды і ўрэгуляваньня спрэчак, зноў паказала свой сапраўдны твар. Не навіны, як на бліжэйшай сэсіі рады Ліга Нацый павінна быць зноў пастаўлена пытаньне аб арышце Улітца ў прынцыповым характары. Акрэ таго, трэба было-б падумаць аб тым, каб пры бліжэйшым здарэньні Польшча ня была абрана зноў у раду Лігі Нацый. У якасьці парушэньня міжнародных абавязацельстваў, Польшча ня можа больш быць суддзёю і абвінавайцам у яе ўласнай справе. Асабліва востра крытыкуюць выбрані нямецкага выступленьня па пытаньні аб нацыянальных меншасьцях нацыяналісцкія газэты, якія падкрэсьліваюць, што «фікцыя адзінага лёкарскага фронту паміж Брыянам, Чэмберленам і Штрэзэманам і на гэты раз засталася толькі фікцыяй".

Тэкстыльшчыкі Францыі не здаюцца.

ПАРЫЖ, 9-III. Тэкстыльныя прадпрыёмцы Алюэну адхілілі прапазову прэфэкта дэпартаменту аб перадачы канфлікту паміж імі і бастуючымі рабочымі на вырашэньне арбітражнае камісіі. Пры гэтым прадпрыёмцы заявілі, што яны адмаўляюцца абмяркоўваць пытаньне аб якім-бы то ні было падвышэньні зарплаты. Водлуг паведамленьня «Юманітэ», гэта адозва выклікала новыя рэпрэсіі супроць бастуючых; зроблены шматлікія вобыскі ў актыўных удзельнікаў забастоўкі і ў членаў стачачнага камітэту.

Французкія мэталісты энэргічна вядуць далейшую барацьбу

ПАРЫЖ, 9-3. Бастуючыя ў Бардо мэталёўцы зьвярнуліся да салдат мясцовага гарнізону з заклікам да братаньня. Водлуг паведамленьня «Юманітэ», гэта адозва выклікала новыя рэпрэсіі супроць бастуючых; зроблены шматлікія вобыскі ў актыўных удзельнікаў забастоўкі і ў членаў стачачнага камітэту.

СУПРОЦЬ ФАШЫЗМУ, ІМПЭРЫЯЛІЗМУ І ВАЕННАЙ НЕБЯСЬПЕКІ

Антыфашысцкі кангрэс у Бэрліне.

БЭРЛІН, 9-3. Выступаючы на бэрлінскім антыфашысцкім кангрэсе з дакладам аб «фашызме, імпэрыялізме і ваеннай небясьпецы», Барбюс зазначыў, што „барацьба з фашызмам зьяўляецца задачаю ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва і, асабліва, рабочых, сялян, дробнае буржуазеі, інтэлігентаў і нацыянальных меншасьцяў. Барацьба будзе адбывацца пад кіраўніцтвам рабочае клясы, бо толькі рабочая кляса ўладае гістарычнымі мэтамі. Барбюс зазначае на неабходнасьць далейшае падрыхтоўкі барацьбы з фашызмам і стварэньня арганізацыі, кіруючае барацьбою.

Вэнгерскі дэлегат Карольні ў сваёй прамове зазначыў, што фашызм у Вэнгрыі мае асаблівыя формы. Вэнгерскі фашызм падтрымліваецца італьянскім, за што распачаецца падтрыманьнем італьянскага імпэрыялізму. Вэнгерскі фашызм хоча растаць працоўныя масы ў якасьці гарматнага мяса для італьянскіх імпэрыялістаў рыхтуючыся да вайны пад лёзунгам перагляду Трыянонскага дагавору.

Чэхаславацкія дэлегаты далі ў сваіх прамовах малюнак бязьлітаснага прыгнечаньня працоўных мас чэшскімі пануючымі клясамі і асабліва падкрэсьлілі жахі фашысцкага тэрору ў Прыкарпацкай Русі. Лева-буржуазны літэратар Манфрэ Георг заявіў у сваёй прамове, што ў Нямеччыне ад рэвалюцыйных заваёў не засталося нічога. Сацыял-дэмакратыя духоўна паралізавала рабочую клясу. Георг падкрэсьлівае неперасрэдную небясьпеку фашызму ў Нямеччыне. Адзін з кіраўнікоў паходу ва Італіі бесп[illegible] на Лёндан Мілітанг заначае, што капітыналістальнай Эўропе існуе няверная думка, быццам у Англіі няма ніякага фашызму. На справе-ж налічваюць фашысцкіх тэндэнцый у Англіі характарызуецца законам супроць прафсаюзаў, зьнішчэньнем дэмакратычнага духу ў галіне сацыяльнага забясьпечаньня, перагаворамі па пытаньню аб міры ў прамысловасьці і г. д. Добры прыём, які быў аказан бесспрацоўным, удзельнічаючым у паходзе, рабочымі шматлікіх вёсак і гарадоў, даводзіць, што ангельская рабочая кляса гатова да барацьбы супроць фашызму і імпэрыялізму. Кандэпутат швэйцарскага парляманту Гельці ў сваёй прамове адзначыў, што Швэйцарыя, якую называюць „старэйшаю краінай дэмакратыі", таксама зьяўляецца ў сучасны момант арэнаю распаўсюджаньня фашызму. У пацьвярджэньне гэтага становішча Гельці падаў шматлікія прыклады, як-та: забойства Вароўскага, апраўданьне яго забойцы, прадушэньне антыфашысцкага руху ўладаю і адкрытае разьвіцьцё фашызму ў населенай італьянцамі частцы Швэйцарыі. Выступаўшы пасьля член ЦК галяндзкае кампартыі Гэккерт спасылаючыся на шэраг фактаў, паказаў, што сапраўднымі папярэдникамі і дапаможнікамі фашызму зьяўляюцца ўсюды рэфармісты. Так, напрыклад, у Гішпаніі рэфармісцкія прафсаюзы супрацоўнічаюць з урадам дыктатара Прыма-дэ-Рывэра; у Францыі Поль Бонкур зьяўляецца аўтарам мілітарысцкага закону аб „нацыянальнай мабілізацыі"; у Кіпеччыне сацыял-дэмакратычны паліцэй-прэзыдэнт Бэрліна Цэргібел забараняе дэманстрацыі, а сацыял-дэмакрат Фэрзінг зьвярнуўся да прамыслоўцаў з абежнікам, у якім запрашае іх падтрымліваць «саюз рэспубліканскага сьцягу», бо гэты саюз, водлуг слоў Фэрзінга павінен перайсьці ў наступ супроць на муністаў і чырвоных франтавікоў. «Ва ўсіх гэтых выпадках—кажа Гэккэр—гутарка ідзе пра генэралаў фашызму в членскімі карткамі сацыял-дэмакратычнай партыі. Барацьба супроць фашызму азначае таксама барацьбу супроць 2-га Інтэрнацыяналу.

* * *

БЭРЛІН, 10-III. На антыфашысцкі кангрэс, які адбываецца ў Бэрліне, прыехала 296 дэлегатаў ад Нямеччыны, Францыі, Англіі, Чэха-Славакіі, Аўстрыі, Польшчы, Нарвэгіі і шэрагу іншых краін. Сярод дэлегатаў, прысланых рознымі арганізацыямі, 30 дэлегатаў ад сялянскае групы, 22 ад арганізацый моладзі і 7 ад інвалідаў вайны. Апроч 4-х дэлегатаў савецкіх прафсаюзаў візу на выезд не атрымалі таксама бэльгійскія дэлегаты.

Кангрэс, выслухаўшы паведамленьне Мюнцэнбэрга аб гэтым, вынес суровую рэзалюцыю пратэсту.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

ПАЧЫН ЛУГАНСКІХ РАБОЧЫХ.

ЛУГАНСК, 11-3. Рабочыя шахты імя Ільліча Кадаеўскага кіраўніцтва капальнямі адаслалі на імя т. т. Сталіна і Касіора наступны зварот: «рабочыя шахты імя Ільліча аднагалосна пастанавілі адпрацаваць надзельнік за ардзінарную плату, каб даць краіне вугаль, і пасылаюць гарачае шахцёрскае прывітаньне Ленінскаму ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)У. Задачы, якія на нас усклаце партыя, урад і рабочая кляса СССР у галіне падвышэньня прадукцыйнасьці працы, зьніжэньня сабекошту, павялічэньня здабычы вугалю гарнякі Кадыеўкі выканаюць з гонарам».

Спаборніцтва па радыё.

НОВАСІБІРСК, 10-3. Рэдакцыя «Рабочае Радыёгазэты» сібірскае шырокавяшчальнае станцыі распачала правядзеньне першага рабочага спаборніцтва на радыё. Чыгуначнікі Омску, Новасібірску і Барнаулу выкліканы на спаборніцтва з Краснаярскімі чыгуначнікамі ў справе паленшаньня якасьці рамонту цягнікоў, узьняцьця працоўнае дысцыпліны, зьніжэньня сабекошту і паскораньня тэрміну рамонту.

ЦАРКОЎНІКІ ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ ЗАГАТОЎКАМ ХЛЕБА.

АЛМА-АТА. 7-III. У станіцы Талгар, Ісыцкага райёну адначасна з «чырвоным абозам» царкоўнікі наладзілі свой абоз для забясьпекі папоў. Згодна пастановы беднаты выканком накіраваў папоўскі абоз з хлебам у канфіскацыю. Добрымі асобамі, якія ахвяравалі хлеб для гэтага абходу, зьяўляюцца кулакі, зносныя пядатчыкі хлеба.

АЭРАСАННЫ ПРАБЕГ.

АХАНСК, 11-3. На гарыстым вучастку Дэбэсы-Ханск аэрасані сустрэлі лясы. Прыходзілася ісьці па цаліне і браць пад'ёмы. Двое галоўных саняў Цагі прайшлі шлях лёгка. Усюды ў сёлах і вёсках сяляне сустракаюць з чырвонымі сьцягамі. Усюды ідзе Аўтадору сустракае агульнае сачуваньне.

10-га сакавіка сані прыбываюць у Пермь, самы далёкі пункт іх аддаленьня ад Масквы.

АЭРА-САНІ ПРЫБЫЛІ Ў ПЕРМЬ.

ПЕРМЬ, 10-3. З прыбыцьцем аэрасанак у Пермь скончана асноўная і найбольш цяжкая частка прабегу. Далейшы шлях ад Пермі да Масквы зьвяцца выпрабаваньнем аэрасанак ва ўмовах наближаючайся адлігі. У Пермь галоўныя санкі калоны „Цагі" прыбылі 10 сакавіка а 12 гадзіне па мясцоваму часу пры вельмі моцнай пазахіліцы.

Дапамога падшэфным вёскам.

ІЛЫНСК, 10-3. Рабочыя галоўных чыгуначных майстэрняў, з заводам «Мэталіст» і „Сьліп" арганізавалі рамонтныя брыгады для рамонту сельска-гаспадарчых машын і прыладаў у падшэфных валасьцёх. Брыгады выехалі ў вёску. Рабочыя гэтых прадпрыёмстваў выклікаюць рабочых іншых фабрык і заводаў дапамагчы вёсцы ў падрыхтоўцы да севу.

Лютаўская рэвалюцыя скінула цара, але не дала працоўным ні міру, ні хлеба, ні зямлі.
Толькі Кастрычнікавая рэвалюцыя вызваліла рабочых і сялян ад прыгнёту капіталістаў.

Яшчэ адна гадавіна.

12-га сакавіка—дата візьвяржэньня самадзяржаўя расейскім пралетарыятам. Гэта дата палажыла канец парскаму самаўладзтву, але не перадала яшчэ улады пралетарыяту.

Лютаўская рэвалюцыя была на першы погляд тыпічнай буржуазнай рэвалюцыяй. Яна дала ўладу буржуазеі, скінуўшы манархію і намешчыкаў. Рабочая кляса і армія, зрабіўшы рэвалюцыю і забясьпечыўшы ёй перамогу, перадала ўладу буржуазеі, г. з. прарыва, здавалася-б, тое самае, што характэрна для ўсіх буржуазных рэвалюцый 19-га стагодзьдзя.

Але ўвесь далейшы ход рэвалюцыі ўжо не пашоў па старому „европейскому шаблону" „классических" буржуазных рэвалюцый. Праўда, рэвалюцыя перадала ўладу буржуазеі, і прычыны гэтай перадачы т. Ленін шукаў ня толькі ў здрадніцтве меншавікоў і эсэраў, але і ў „несьвядомай даверлівасьці мас к ураду капіталістаў", у дробнабуржуазных ілюзіях, якія яшчэ крэпка трымаліся сярод пралетарыяту і асабліва сярод арміі. Таму Лютаўская рэвалюцыя не магла з самага свайго пачатку пераскочыць у сацыялістычную рэвалюцыю.

Першы ўдар пралетарыяту і сялянства быў накіраваны супроць самадзяржаўя і крэпасьніцтва. Калі гэты ўдар нечакана хутка даў перамогу, масы не пасьпелі «як сьлед разгледзець».

Усеагульнае ап'яненьне і лікаваньне з прычыны атрыманай перамогі зацьмяніла ўсе астатнія пытаньні. Было скінута самаўзяржаўе, якое на працягу дзесяцігодзьдзяў зьяўлялася сынонімам усялякіх зьдзекаў і прыгнечаньня. На першыя дні гэтага было дастаткова. Пралетарыят, яго лёзунгі, яго клясавая лінія растварыліся ў гэтай усеагульнай, апанаваўшай усе слаі насельніцтва хвалі ап'яненьня і ўсеагульнага братаньня.

„Баюся—пісаў Ленін—што хваробаю навальнай цяпер будзе ў Піцеры проста захапленьне".

У першыя дні націску рэвалюцыі пануючым быў лёзунг візьвяржэньня самадзяржаўя. І калі гэты лёзунг нечакана хутка ажыцьцявіўся,—масы, нават пралетарскія, ня меўшыя, не асазнаўшыя сваёй станоўчай праграмы, не маглі не захапіцца такім аграмадзейшым к таму часу фактам, як падзеньне самадзяржаўя. У гэтым захапленьні і прычыны перадачы ўлады буржуазеі.

Тав. Уладзімір Ільліч даў вусім дакладнае клясавае вызначэньне новаму ўраду, які прышоў да ўлады. „Гэты ўрад—не выпадковае зборышча асоб. Гэта—прадстаўнікі новай клясы, якая ўзьнялася да палітычнай улады ў Расеі, клясы капіталістычных памешчыкаў і буржуазеі, якая (кляса) даўно кіруе нашым краем эканамічна і якая, як за час рэвалюцыі 1905-1907 г. г., так і за час контр-рэвалюцыі 1907-1914 г. г., як, нарэшце,—і пры гэтым з асаблівай шпаркасьцю—за час вайны 1914-1917 г. г. надзвычайна хутка арганізавалася палітычна, захапіла ў свае рукі і мясцовае самакіраўніцтва, і народную асьвету, і зьезды розных гатункаў і Думу, і вайсково-прамысловыя комітэты і інш.»

Найбольш глыбокія супярэчнасьці, якімі была выклікана Лютаўская рэвалюцыя, гэта рэвалюцыя ня вырашыла, а ў сутнасьці толькі яшчэ больш іх абнажыла і зрабіла іх больш наяўнымі.

У самай справе, рашаючую ролю ў лютаўскай рэвалюцыі адыграла паўстаньне арміі. Але армія па сутнасьці паўстала супроць прадаўжэньня імпэрыялістычнай вайны. А ўлада ў лютым папала ў рукі клясы, якая была душою гэтай бойні і якая імкнулася захаваць вернасьць Антанце, выкарыстаць пераварот у мэтах больш пасьпяховай арганізацыі «перамогі» над Нямеччынай.

Зусім ня дзіва пасьля гэтага, што ў самыя-ж першыя дні лютага вызьвіліся такія вострыя супярэчнасьці паміж салдатамі і ўрадам.

У такой краіне, як Расея, рашаючым рэзэрвам усякай рэвалюцыі было сялянства. Лютаўскі пераварот уцягнуў у сваю арбіту толькі самы авангардны слой сялянства, які ўдзельнічаў у рэвалюцыі, галоўным чынам, праз армію. Для ўсёй вясковай гушчы люты толькі прыадчыніў дзьверы в грамадзкай і рэвалюцыйнай актыўнасьці, сялянства выступала у барацьбе за зямлю. Між тым люты заставіў ва ўладзе абшарніцкіх прыхільнікаў, якія сталі сьвядома на месца старой улады в мэтаю захаваць прыватную ўласнасьць, у тым ліку і на зямлю.

Пралетарыят таксама ня мог атрымаць здавальненьня ў буржуазнай рэвалюцыі. Люты ня даў яму нават таго, што магла б даць буржуазная рэвалюцыя. У такіх умовах ня толькі перадавая частка, але і ўся маса пралетарыяту нямінуча штурхалася да выкананьня гістарычнай місіі пралетарыяту—стаць на чале прыгнечаных мас у барацьбе супроць багатых.

Побач з буржуазным часовым урадам лютаўская рэвалюцыя ўтварыла саветы,—гэтую другую сілу, якая мізрынула цара, а потым буржуазею.

Лютаўская рэвалюцыя пачынае перарастаць у Кастрычнікавую. Люты быў толькі адным з момантаў у падрыхтоўцы да рэвгортваньня Кастрычнікавай рэвалюцыі.

ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ.
СТАРШЫНЁЙ ЦК АБРАНЫ т. АБОЛІН.

МАСКВА, 9-3. Учора зачыніўся 7-ы ўсесаюзны зьезд працаўнікоў асьветы. На заключным пасяджэньні зьезд зацьвердзіў рэзалюцыі па ўсіх пытаньнях парадку дня. Зьезд абраў новы ЦК саюзу ў складзе 63 чалавек, сярод якіх 21 настаўнік і 3 палітасьветпрацаўнікі. Каля паловы ўсяго складу ЦК саюзу жанчыны. Адбыўшыся пасьля зачыненьня зьезду пленум ЦК саюзу абраў старшынёю ЦК саюзу т. А. К. Аболіна, сакратаром — Механошыну. Новы старшыня ЦК саюзу рабасьветы т. А. К. Аболін—член партыі з 1908 году. Да абраньня ЦК саюзу рабасьветы т. Аболін быў сакратаром Сярэдня-Волскага вобласнога камітэту УсеКП(б).

Посьпехі украінскае народнае песьні за межамі.

КІЕЎ, 8-3. Сёньня пасьля 2-хмесячнага пабыту заграніцаю ў Кіеў вярнулася капэла «Думка». Пабыт капэлі ў Францыі быў трыумфам украінскае народнае песьні і украінскага музычнага мастацтва. Першы канцэрт «Думкі» перадаваўся па радыё па ўсёй Францыі. Капэла ў часе пабыту заграніцаю атрымала многа прывітаньняў і добрых водгукаў.

Па Беларускай ССР.
(Ад нашых карэспандэнтаў).

Ніводнага зярна прыватніку.
(КАЛЕКТЫЎНАЯ ЗДАЧА ХЛЕБА Ў МЕНСКАЙ АКРУЗЕ).

З пачатку сакавіка месяца па Менскай акрузе пачалася калектыўная здача хлеба ў спажывецкую кааперацыю.

Сыгнал падала мяжа. 3-га сакавіка ў Негарэлым (на самай мяжы) можна было бачыць, як абоз з 32 падвод цягнуўся па станцыю з хлебам. Вёскі Калоднікі і Камароўшчына — першыя адгукнуліся арганізаванай дапамогай савецкай уладзе ў тых цяжкасьцях, якія перажывае краіна, здалі лішкі хлеба ў кааперацыю.

Потым 5, 6 га пацягнуліся іншыя вёскі і па сёньня па Койданаўскаму раёну прашло 4 калектыўных здач хлеба (каля 800 пудоў), навакол якіх з'арганізаваліся 307 гаспадарак Негарэлаўскага вучастку.

Найбольш моцная дэманстрацыя змычкі працоўнага сялянства Негарэльшчыны з рабочай клясай была 6-га сакавіка, калі 224 сялянскія падводы з хлебам былі сустрэты прадстаўнікамі мясцовых кааператыўных, партыйных і савецкіх арганізацый, прадстаўнікамі Койданаўскага раённага зьезду саветаў, Чырвонай арміі і ўраду БССР.

Пасьля ўзаемных прывітаньняў, дэлегацыя сялян-здатчыкаў пасхала ў Койданава вітаць 5-ты раённы зьезд саветаў у час яго дзелавой работы.

Гэтакія-ж дэманстрацыі прайшлі ў Самахвалавічах і Пухавічах 3-га і 8-га сакавіка.

Усяго пакуль што 6 чырвоных абозаў, у ліку 402 падвод, здалі ў спажывецкую кааперацыю каля 1.300 п. хлеба.

Уся кампанія праходзіць пад лёзунгам «Ніводнага зярна на прыватны рынак—усе лішкі хлеба ў кааперацыю».

Абозьнікі заклікаюць сялян іншых вёсак пасьледаваць іх прыкладу.

Ёсьць весткі, што гэты выклік дасьць вынікі ў выглядзе больш моцнай арганізацыі працоўнага сялянства ў калектыўнай здачы хлеба кааперацыі. Кулак, як заўсёды, ужо паказвае свой твар—не здае хлеба і актыўна выступае супроць гэтае кампаніі, прабуе парваць бяднацка-серадняцкі блёк, але справа паказала, што гэтыя асобныя спробы кулацтва ня заставілі працоўнага сялянства ў масавай дэманстрацыі змычкі, якая далкам праходзіць пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі Беларусі.

Прыгукоў.

Урачыста адсьвяткавалі 8-е сакавіка.

Гомель, 2-3. Сьвяткаваньне 8 га сакавіка прайшло пры актыўным удзеле усіх працоўных. Сьвяткаваньне адзначана вылучэньнем работніц на адказную працу, закладзай дамоў для дзіцячых садоў, арганізацыяй жаночых арцеляй у Хойнікскім, Уваравіцкім і Брагінскім раёнах. Кааперацыйнымі арганізацыямі адпушчаны сродкі для арганізацыі дзіцячых пляцовак у малочных арцелях, калгасах і для дзяцей членаў сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў. У Гомелі панчошная арцель з беспрацоўных перайменавана ў фабрыку «імя 8-га сакавіка». Фабрыка з гэтага-ж дню перайшла на працу ў дзьве зьмены, што дало павялічэньне ліку рабочых.

КААПЭРАВАНЬНЕ ІДЗЕ СЛАБА.

Полацак, 9-3. На сыстэме сельска-гаспадарчай кааперацыі па крэдытнай сетцы на 1 кастрычніка 1928 г. было кааперавана 27520 гаспадарак, альбо 43 проц. да агульнага ліку сельскіх гаспадарак округі. Паявы капітал складаў 163695 р., што складала сярэдні пай на аднаго пайшчыка 5 р. 94 к. На 1 студзеня кааперавана за 3 месяцы ўсяго 629 гаспадарак з павялічэньнем паявога капіталу на 7190 р. Такім чынам, кааперавана ўсяго 44 проц. з сярэднім паем—6 р. 09 к.

Справа з спагнаньнем паявой запазычанасьці абстаіць кепска. Акрсельбанкам вылучаны ўпаўнаважаныя, якія прымацаваны да раёнаў.

Ёсьць думка, што ў сувязі з правядзеньнем вясеньняй пасяўкампаніі справа з кааперараваньнем сельскіх гаспадарак і спагнаньнем паявой запазычанасьці будзе палепшана.

П. А—ін.

Зьнішчаем няпісьменнасьць.
(*Юраўскі с.-с. Смалявіцкі р.*).

Невялічная вёска, кілёмэтраў 15-18 ад райённага цэнтру і чыгункі; няма школы. 3-за адсутнасьці школы дзеці ходзяць 3-4 кілёмэтры ў суседнюю вёску. Процант ходзячых дзяцей у школу дасягае 30-35 агульнага ліку школьнага ўзросту. Процант пісьменных дарослых зусім невялічкі.

Вось у якіх умовах распачаў працу лікпункт. Працу на лікпунце вядзе Тубылец, дзяўчына, скончыўшая пачатковую школу, пад кіраўніцтвам і наглядам суседняй школы.

Ня можна пахваліцца самаарганізацыяй лікпункта, намісці і вучнаму—усё ў зародкаваым стане. Грамадзкая праца лікпункту не дасягае належнага стану. 22 чалавекі напісьменныя вёскі, з якіх 18 дзяўчат, ахоплены вучобай. Паступі шы ў кастрычніку, ня ведаючы ні «а» ні «б», дзякуючы амаль штодзённай працы, упартай працы, дзякуючы ўмо добра чытаюць, пішуць, рашаюць задачы.

Тав. Кучар, загадчыца лікпункту, укладае ўвесь свой вопыт, здольнасьці і энэргію. Працуючы ўжо 5 месяцаў дармова—яна бясплатна, безузьмінна вядзе працу. Вучыцца сама—вучыць другіх. Колькі клопату, энэргіі патрабуецца ўкладзі, калі зьбярэцца амаль усе дзяўчаты вёскі **МН.**

СПЭКУЛЯНТЫ-ГАНДЛЯРЫ Ў КААПЭРАЦЫІ.

Марына-Горскае спажывецкае таварыства адчыніла мяса-сальную краму, т-ва нела мэту даставіць пайшчыкам тавара мяса і сала, таксама выцісьнуць прыватны гандаль. Але вышла ня так. У сальную краму ўзяты 3 браты—былыя вядомыя гандляры, ня толькі ў райёне, а нават у акрузе, а ў мясную 2 гандляры. Гэтыя гандляры зьвязаны і цяпер з спэкулянтамі, якім прадаюць сала і мяса. Калі адбываўся сход упаўнаважаных, дык ён прапанаваў праўленьню аднаго працаўніка крамы зьняць з працы, але праўленьне і гэтага не зрабіла.

Трэба ачысьціць кааперацыю ад гандляроў.

М. Вярба.

АДОЗВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БЕЛАРУСКАЕ ССР
аб пашырэньні яравых пасеваў і ўздыме ўраджайнасьці.
Да сялянства Савецкай Беларусі.

Рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) упарта працуюць над аднаўленьнем і перабудовай зруйнаванай імпэрыялістычнай і грамадзянскай войнамі народнай гаспадаркі Савецкай Беларусі. Сельская гаспадарка, адноўленая пры савецкай уладзе аграрнай рэвалюцыяй, хутка пашла па шляху сваёй адбудовы. Пасяўная плошча, скарочаная за час грамадзянскай вайны да паловы даваеннага разьмеру, цяпер ужо значна перавышае даваенную норму. Вёска кідае старыя формы землякарыстаньня і пераходзіць на пасёлкі і калектывы, мяняючы трохполку на шматпольны севазварот і г. д. Пашыраецца вытворчае кааперараваньне сельскай гаспадаркі, умацоўваюцца савецкія гаспадаркі і калектывы, як падстава да пашырэньня індустрыялізацыі і электрыфікацыі сельскае гаспадаркі.

Аднак і цяпер яшчэ сельская гаспадарка дае надзвычайна нізкія ўраджаі.

Нізкі ўраджай—адна з важнейшых прычын нашай беднасьці. Вось чаму савецкая ўлада прызывае ўсё працоўнае сялянства і ўсю савецкую грамадзкасьць да яшчэ больш упартай працы па ўзьняцьцю ўраджайнасьці.

На бліжэйшае пяцігодзьдзе савецкая ўлада паставіла перад сабою і сялянствам задачу падвысіць ураджайнасьць ня менш, чым на 45 проц.

Кожны год савецкая ўлада ўкладае на разьвіцьцё сельскай гаспадаркі дзесяткі мілёнаў рублёў, а ў бягучым годзе на мерапрыёмствы сельскае гаспадаркі Беларусі дзяржава ўкладзе звыш 40 мілёнаў рублёў. Гэтыя сродкі поўнасьцю пойдуць на забясьпячэньне савецкіх, калектыўных і сялянскіх гаспадарак сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі, угнаеньнем, насеньнем, на правядзеньне зямлеўпарадкаваньня, мэліярацыі, на разьвіцьцё жывёлагадоўлі і на пабудову заводаў па пераапрацоўцы прадуктаў сельскае гаспадаркі.

Імкненьне савецкай улады дапамагчы сялянству хутчэй пабудаваць сельскую гаспадарку у напрамку больш высокай ураджайнасьці і яе прыбытковасьці з большым посьпехам будзе вырашана, калі кожны селянін і сялянка з свайго боку будуць імкнуцца да палепшаньня сваёй гаспадаркі, да павялічэньня ўраджайнасьці і г. д.

Найбольшая карысьць ад укладаньня дзяржаўных сродкаў на разьвіцьцё сельскае гаспадаркі будзе тады, калі і сялянства з свайго боку будзе ўкладаць свае ўласныя сродкі на палепшаньне сваёй гаспадаркі.

Прыклады савецкіх, калектыўных перадавых сялянскіх гаспадарак, вопыты дасьледчых станцый паказваюць поўную магчымасьць пры ўвядзеньні палепшаных спосабаў вядзеньня сельскай гаспадаркі дабіцца ў бліжэйшыя гады значнага павялічэньня ўраджайнасьці ў сельскай гаспадарцы.

Падыходзіць вясеньняя сяўба—самы адказны перыяд сельска-гаспадарчага году сялянства.

Ужо з бягучай вясны мы павінны прыступіць да вырашэньня пастаўленай задачы па ўздыму ўраджайнасьці і правесьці шэраг агрыкультурных палепшаньняў, якія-б забясьпечылі падвышэньне ўраджайнасьці па 7 проц. і пашырэньне агульнага пасеву плошчы ня менш, чым на 3 проц.

У першую чаргу трэба павялічыць яравы палетак, праз скарачэньне незанятага папару і распашку новых плошчаў зямлі пад пасевы. У Беларусі ёсьць яшчэ магчымасьці для пашырэньня пасеваў за кошт раскарчовак, мэліараваньня і г. д. Каб пашырыць плошчу засеваў, савецкая ўлада аслабане на 2 гады ад сельска-гаспадарчага падатку новыя плошчы пасеву. Павялічэньне яравога кліну дасьць значнае павялічэньне прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Разам з гэтым патрэбна павялічыць пасеў найбольш карысных для сельскай гаспадаркі тэхнічных культур (лёну і канапель), прапашных (бульбы і карняплодаў), травяных (канюшыны, сэрадэлі і вікі) і пасеву лубіну на зялёнае ўгнаеньню і на насеньне.

Пашыраючы пасевы гэтых культур, сялянства ня толькі павялічвае прадукты для разьвіцьця малочнай гаспадаркі, як найбольш карысная ва ўмовах БССР, але адначасова забясьпечвае прамысловасьць (фабрыкі і заводы) належнай сыравінай для яе вытворчасьці.

Побач з задачамі пашырэньня яравога палетку і пасеваў найбольш карысных культур у сельскай гаспадарцы, стаіць яшчэ больш важная задача—павялічэньне ўраджайнасьці.

Пасьпяховае вырашэньне пастаўленай задачы ў значнай частцы магчыма пры ўмове, калі асноўная маса бяднацка-серадняцкіх гаспадарак пяройдзе да ўжываньня ў сваіх гаспадарках прасьцейшых агрыкультурных мерапрыёмстваў. Да гэтакіх мерапрыёмстваў адносяцца: ачыстка і сартаваньне насеньня, радковы пасеў, пераход да ўжываньня сартавых пасеваў, зьнішчэньне межнікаў, барацьба са шкоднікамі сельскай гаспадаркі і пустазельлем, пашырэньне палепшаных спосабаў апрацоўкі, занятых і раньнія папары, зяблевае ворыва, забарона пасьбы скаціны на азімых, шырокае выкарыстоўваньне штучных угнаеньняў: вапны, попелу, торфу, а таксама зялёнага ўгнаеньня (лубіну, сэрадэлі), больш поўнае скарыстоўваньне палепшанага с.-г. інвэнтару, які ёсьць у сялянскіх гаспадарках, саўгасах, калгасах і пракатпунктах, а таксама праз арганізацыю машынных і насяльковых таварыстваў на агульнаму набыцьцю і скарыстоўваньню с.-г. машын і прыладаў. Каб садзейнічаць правядзеньню ў жыцьцё гэтых мерапрыёмстваў, закон аб с.-г. падатку таксама прадугледжвае гаспадаркам, скарыстаўшым азначаныя мерапрыёмствы, шэраг ільгот.

Зразумелая рэч, што найбольш пасьпяховае вырашэньне задачы па ўздыму ўраджайнасьці і павялічэньні вытворчасьці сельскае гаспадаркі пад сілу, у першую чаргу, калектыўным гаспадаркам, камунам, арцелям і таварыствам па супольнай апрацоўцы зямлі. У асобнай сялянскай гаспадарцы часта няма палепшанага сельска-гаспадарчага інвэнтару, без якога немагчыма перавесьці гаспадарку на больш высокі ўзровень вытворчасьці.

Адсюль вывад, што найбольш хуткі і правільны шлях да павялічэньня вытворчасьці сельскай гаспадаркі—гэта шлях, паказаны савецкай уладай,—шлях аб'яднаньня бяднацкіх і серадняцкіх гаспадарак у арцелі, камуны і кааперацыйныя таварыствы.

Савецкія гаспадаркі, камуны і арцелі сваімі машынамі, прыладамі, насеньнем і вопытам павінны быць паказальнымі па найбольш выгаднаму спосабу вядзеньня сельскае гаспадаркі.

Пасьпяховае вырашэньне задач вясеньняй пасяўной кампаніі і ўздыму ўраджайнасьці і вытворчасьці сельскай гаспадаркі магчыма, калі ў гэтую справу будуць уцягнуты шырокія колы сялянства, асабліва перадавыя яго слаі. Толькі пры магутным уздыме самадзейнасьці самога сялянства магчыма пасьпяхова правесьці вясеньнюю пасяўную кампанію. Усе спэцыялісты сельскай гаспадаркі і наогул уся савецкая грамадзкасьць павінны дапамагчы сялянству ў працы па ўздыму ўраджайнасьці.

Прэзыдыум ЦВК БССР зварочваецца з заклікам да сельска-гаспадарчых рабочых і работніц, сялян і сялянак, сяброў арцеляй, камун і калектываў, да кааперацыйных аб'яднаньняў, да ўсіх спэцыялістаў сельскай гаспадаркі—рашуча і сьвядома правесьці вясеньнюю сяўбу пад знакам павялічэньня, пашырэньня яравога пасеву, павялічэньня ўраджайнасьці, пашырэньня тэхнічных і рыначных культур і пераходу да калектывізацыі, што зьяўляецца верным шляхам сацыялістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі.

Гэту адозву прапануецца прачытаць і рэтлумачыць ва ўсіх сельскіх пасялішчах на агульных сходах. Граматны прачытай няграматнаму.

Агранамічнаму персаналу прапануецца даць практычныя паказаньні аб масавых агранамічных мерапрыёмствах, прыстасаваўшы іх да асаблівасьцяй кожнага райёну і вёскі.

Грамадзкім арганізацыям трэба пры ўдзеле агранамічных сіл паставіць перад сабою практычныя задачы і наглядаць за іх правядзеньнем у жыцьцё.

Нам трэба дабіцца таго, каб Беларуская ССР зьяўлялася райёнам самых высокіх ураджаяў у Саюзе ССР!

За працу!

Старшыня Цэнтральн. Вык. Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральн. Вык. Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

гор. Менск, 11 сакавіка 1929 г.

Райённыя зьезды саветаў вітаюць ЦВК Беларускае ССР.

У прэзыдыум ЦВК БССР паступілі прывітальныя тэлеграмы ад Койданаўскага, Чэрвенскага і Халопеніцкага райённых зьездаў саветаў.

У тэлеграмах райённыя зьезды саветаў, вітаючы Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР, запэўняюць, што яшчэ з большай энэргіяй павядуць працу па калектывізацыі сельскай гаспадаркі, па падвышэньню ўраджайнасьці і індустрыялізацыі краіны.

ПРАЛЕТАРЫЯТ У ЛЮТАЎСКІЯ ДНІ 1917 г.

Набліжэньне рэвалюцыйнага выбуху было ўжо відавочна тым, хто ўважліва сачыў за падзеямі расейскага жыцьця, ужо ў 1915 годзе. Падзеі студзеня і лютага месяцаў 1917 году праходзяць пад адзнакай набліжэньня рэвалюцыі. У абарончых і зьвязаных з імі колах была думка прыстасаваць вялікае выступленьне рабочых да дню адчыненьня дзяржаўнае думы ў сярэдзіне лютага. Думка гэта сустрэла вострыя адпор з боку інтэрнацыяналістычных арганізацый, і рабочыя не пашлі за абаронцамі. Але тут цікава адзначыць, што перспэктыва выступленьня рабочых, інсцэніруемага прыслешнікамі і слугамі буржуазеі, вельмі настрашыла буржуазею. Буржуазея дасканала разумела, што рэвалюцыі ёй ня ўхіліцца, але буржуазея баялася і не жадала масавага выступленьня пралетарыяту. Пагэтаму, як толькі пытаньне аб масавай дэманстрацыі петраградзкага пралетарыяту стала ў парадак дню, буржуазея далучыла свой голас да голасу петраградзкага камандуючага войскамі Хабалава, які ўзнагародзіў і ўгаварваў рабочых ня прымаць удзелу ў гэтай дэманстрацыі. Мілюкоў, фактычны кіраўнік буржуазнай Расеі, зьнясьціў у газэтах заклік да рабочых—«ня прымаць удзелу ў дэманстрацыях 14 лютага і заставацца ў гэты дзень спакойнымі».

Дэманстрацыя 14 лютага не ўдалася, яна не адбылася. Рабочыя не пашлі за абаронцамі, але рэвалюцыйны рух у рабочых шэрагах ня спыніўся, наадварот—узмацняўся.

Першы днём рабочага руху ў Петраградзе можна лічыць 23 лютага. У гэты дзень баставала 50 прадпрыёмстваў, і 87.534 пралетарыяты Петраграду прынялі ў гэтым удзел. Рух узрастаў надзвычайна шпарка: 24-га лютага ў ім ужо прымала ўдзел 197.000 рабочых. 25-га у ім прымала ўдзел ужо 240.000 рабочых, і ўвечары гэтага дню Выбаргскі раён Петраграду, населены, галоўным чынам, рабочымі, палкам пераходзіць у руху паўстаўшага народу. Зносіны граданачальства з Выбаргскай стараной у гэты дзень спыняюцца. 26 рух усё ўзрастае, а пятай гадзіне дню 27-га ва ўладзе прыхільнікаў старога рэжыму застаецца толькі граданачальства, адміралцейства, зімні палац, тэлефонная станцыя і Петрапаўлаўская крэпасьць.

Поруч з устойлівасьцю і ўпартасьцю, рух выяўляе ня толькі колькасны рост, але і якасны рост, які пачаўся, як масавая палітычная дэманстрацыя; рух пераўтвараецца ў упартую апошнюю бойку з царызмам, пераходзіць у паўстаньне.

Рабочыя імкнуцца захапіць і заваяваць войска, вырваць яго з рук ураду.

Сам урад супроць рабочых выслаў войска, але гэта войска было ўжо ня тое, якое прыдушала рабочы рух у 1905 годзе. Клясавы склад арміі востра выяўляўся. Сутычка войска з паўстаўшым пралетарыятам прыводзіла толькі да таго, што вайсковыя масы разлагаліся, як баявая зброя ў руках ураду, траціві боездольнасьць, пераходзілі на бок паўстаўшых рабочых, рабіліся баявой сілай рэвалюцыі. Кіруючыя рабочым рухам арганізацыі імкнулі і ставілі перад пралетарыятам задачу барацьбы за войска, а не барацьбы з войскам.

Бальшавіцкая арганізацыя ў Петраградзе ў асобе Бюро Цэнтральнага Камітэту і Пецярбургскага Камітэту з першай хвіліны лютаўскага выбуху прымала ў ім найбольш энэргічны ўдзел. 24-га лютага, яшчэ ня будучы ўпэўненым, што адбывалася апошняя бойка з самаўладзтвам, Бюро ЦК ухваліла пастанову разьвіваць і разгортваць рух і імкнуцца захапіць войска.

Побач з настойлівай рэкамэндацыяй партыйным арганізацыям праводзіць іменна гэтую лінію заваёвы войск, Бюро ЦК выдае 27-га лістоўку, дзе, імкнучыся разгарнуць рух, з аднаго боку, робіць спробу пераўтварыць яго з мясцовага петраградзкага, ва ўсерасейскі. Аднаведна гэтаму і бліжэйшай задачай дню бюро ЦК ставіць усерасейскую мэту—вярнуцьце царызму. Гэтая мэта агалашаецца ня як асобны лёзунг, а як канкрэтная задача дню.

Такім чынам, пазыцыя бальшавікоў у лютаўскія дні была ясная. Гэта была пазыцыя не зьмяншэньня руху, а яго разгортваньня і росту: бальшавікі імкнуліся ператварыць рух у апошнюю бойку з царызмам, імкнуліся да зьнішчэньня ўсяго зьвязанага з самаўладзтвам ладу старой Расеі.

Ня гэткая была пазыцыя меншавікоў. Па паведамленьню т. Шляпнікава, пікіі і нідзе не адхіленаму, меншавікі, наадварот, думалі аб спыненьні руху.

«У некаторых колах, блізкіх да абарончых цэнтраў, пагаварвалі аб тым, што трэба ліквідаваць рух. Застаўшаяся на волі частка членаў рабочай групы ваенна-прамысловага камітэту адкрыта выказвалася за скančэньне ўсеагульнай забастоўкі» (Шляпнікаў—«Семнадцатый год», стар. 121).

Мсьціслаўскі ў сваіх успамінах зазначае, што меншавікі і эс-эры тых дзён выразна баяліся мас, баяліся рэвалюцыі.

Так востра і выразна выкрысталізоўваюцца процілеглыя плынні с.-д. з аднаго боку,—бальшавікі, якія ішлі на рэвалюцыю, рыхтаваўшыя яе, кіраваўшыя ёю, прымаўшыя ў ёй гарачы непасрэдны ўдзел, з другога—сацыялістычныя лідэры дзяржаўнай думы, меншавікі і эс-эры—Чхэідзе і Керанскі.

Гэтыя лідэры не пасьпелі і ня здолелі ні спыніць, ні зразумець руху, яны ўяўлялі ўвесь рух мас так, што ўсё зьнікла і загінула ад чыпнасьці гэтых мас. Яны здрадзілі пралетарыяту і сялянству ў першы-ж момант свайго ўступленьня ў Саветы. Лідэры, якія ня верацъ масам, лідэры, якія баяцца мас—гэткая пазыцыя меншавікоў і эс-эраў у лютаўскія дні. Яна шмат што растлумачвае.

Роўналежна з ростам стыхійнага рабочага руху сярод кіруючых колаў пралетарыяту ўзьнікла думка аб паданьні яму плянавасьці і арганізаванасьці і аб стварэньні кіруючых органаў рабочага руху. На ініцыятыве Петраградзкага Саюзу Спажывецкіх Таварыстваў у дзень 25-га лютага ў памяшканьні саюзу быў скліканы сход, на якім прысутнічалі прадстаўнікі меншавікоў і сацыял-дэмакратычнай фракцыі дзяржаўнай думы; тут упершыню нарадзілася думка аб неабходнасьці стварыць Савет Рабочых Дэпутатаў па тыпу Савету 1905 г. Тут жа быў намечан плян арганізацыі Савету. Але плян гэты не ўдалося ажыцьцёвіць.

27-га лютага ў Таўрычанскім палацу, ў пакоі № 12, сабраліся прадстаўнікі рабочых арганізацый. На гэтым сходзе прысутнічалі Керанскі, Чхэідзе, Скобелеў і вызваленыя рэвалюцыяй з Крестоў члены рабочай групы ваенна-прамысловага камітэту. Гэтая група і парашыла зараз жа ўтварыць Савет Рабочых Дэпутатаў. Ёю было пастаноўлена паслаць за ўсе райёны таварышоў з заклікам абірацъ дэпутатаў у Савет, і была выпушчана ад часовага выканаўчага камітэту Савету Рабочых Дэпутатаў адозва з заклікам арганізаваць на заводах і фабрыках выбары ў Савет Ідэя Савету была папулярна ў рабочых шэрагах, і заклік гэты знайшоў водгук. У той момант, калі барацьба на вуліцах яшчэ ня скончылася, і цэнтральныя арганізацыі і асобныя члены партыі бальшавікоў кіравалі барацьбой, меншавікі, кінуўшы думку аб стварэньні Савету, імкнуліся арганізацыйна захапіць і зьвязаць рух.

На першым пасяджэньні Савет сканструіраваўся, як зусім сталая і поўная ўстанова. Самым фактам яго стварэньня стыхійны рух набыў арганізацыйны выраз, набыў арганізацыйны цэнтр, арганізацыйны апарат. Савет рабіўся тым штандарам і тым сьцягам, вакол якога маглі згуртавацца і арганізавацца масы паўстаўшых рабочых і салдат.

На першым-жа пасяджэньні Савету была складзена і выдана адозва да насельніцтва Расеі і Петраграду. Адозва гэта ня толькі растлумачвала падзеі, якія адбыліся, але самае галоўнае, яна гаварыла паўстаўшым, што ёсьць ужо новы цэнтр рабочага руху, што ёсьць ужо апарат рэвалюцыйнай барацьбы рабочай клясы, што зародак улады рабочай клясы існуе і арганізуе сілы вакол сябе. У гэтай-жа адозве Савет рабочых дэпутатаў, запрашаючы ўсіх падтрымаць рабочы рух, заклікаў на мясцох утвараць ячэйкі улады і браць усю справу ў свае рукі. З першых жа крокаў рэвалюцыі выяўлялася асноўная ўласьцівасьць Савету: „Саветы могуць быць органамі ўлады ці нічым».

На пасяджэньні-ж Савету 27-га лютага быў сканструіраван і кіраўнічы орган Савету—яго Выканаўчы Камітэт. У склад першага Выканаўчага Камітэту ўваходзілі: думскія дэпутаты Керанскі, Скобелеў і Чхэідзе і 8 асоб, абраных ад Пленуму Савету: Александровіч-Дзьмітрыеўскі, Шляпнікаў, Паўловіч, Красікаў, Залуцкі, Сьцяклоў, Суханаў, Шатроў-Сакалоўскі і Капялінскі; сэкратары: Гвозьдзеў, Грыневіч-Шэхцер, Панкоў і Сакалоў. Апроч гэтага, былі прадстаўнікі ад партый. Ад бальшавікоў—Молатаў і потым Сталін, ад меншавікоў Багданаў і Батурскі, ад Бунду—Эрліх і Рафэс, ад эс-эраў Русанаў і Зензінаў, ад с.-д. міжрайёнцаў—Юрэнеў, ад латыскіх сацыял-дэмакратаў—Стучка і Казлоўскі, ад п. с.—Пешахонаў і Чарналуцкі, ад трудавікоў—Брамсон і Чайкоўскі, якога потым зьмяніў Станкевіч. Апроч гэтага, у склад Выканаўчага Камітэту ўваходзілі прадстаўнікі нацыянальных сацыялістычных арганізацый.

Момант бойкі ўладарна ставіў перад Саветамі пытаньне аб уладзе; само ўтварэньне Саветаў штурхала рэвалюцыю наперад; Саветам, пры ажыцьцяўленьні праграмы буржуазнай рэвалюцыі — скасаваньне царызму—прыходзілася брацца за ўладу. Але калі Савету прыходзілася прымаць рэвалюцыйныя меры, дык усё-ж, як шчыра зазначыў сам у сваіх запісках Суханаў, Савет не выказваў прыхільнасьці да разьдзьмухваньня рэвалюцыі; наадварот, кіруючае ядро Савету імкнулася ня ўзьнімаць вострых пытаньняў.

«Пытаньне аб вайне і міры,—піша, напрыклад, Суханаў,—было зьнята з чаргі першым плянавым умешваньнем у стыхійны працэс рэвалюцыі. Выканаўчы Камітэт яшчэ ня меў ніякай магчымасьці заняць тую ці іншую пазыцыю па гэтаму пытаньню, і галоўнае—не ў разьліках яго кіруючай большасьці было фарсаваць праблему міру». (Суханаў—«Записки о революции», кн. I, стар. 243).

Аб тым, як ставілася ў кіруючых меншавіцкіх колах Савету праблема ўлады, навуць можна меркаваць толькі водгук паказаньняў Суханава. Савет да ўлады ня імкнуўся, аб захапленьні ўлады ў свае рукі ня думалі; кіраўнікі большасьці баяліся, што буржуазея, чаго добрага, ня возьме ў свае рукі ўлады. Баючыся ўлады, Савет

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

Падлеткі-бунтары.

(Нататкі з дарогі).

Бацькі і сем'і чатырох былых вучняў Талочынскай беларускай сямігодкі (Аршанскай акругі)—сапраўды людзі сёньняшняга дня, толькі яго адваротнага, цёмнага, кулацкага боку.

У Дзянісовіча бацька дэзарганізуе працу калгасу, чытае лекцыі—«не савецкая ўлада, а жыды»,«у калектывы зводзяць хахлы драць». Бацька Белахвосьціка—заможнік, ініцыятар і кіраўнік зрыву самаабкладаньня; хоць карыстаецца вялікімі льготамі (два сыны-чырвонаармейцы), але падатку плаціць 66 руб.

Сапрык таксама можа «гакарыцца» сваім бацькам—заможнік, варожа настроены да савецкай улады. Аб Юхневічу і казаць ня треба: хоць спраўка, выдадзеная сельсаветам, запэўнівае, што ён батрак, але-ж на справе зьўляецца ўтрыманцам ксяндза.

Гэтыя чатыры «атаманы», ды яшчэ група «падсобных», вучыліся ў савецкай школе, супроцьставілі сабе фарвосту, праводзілі контр-рэвалюцыйную працу, а першыя два—Дзянісовіч і Белахвосьцік—нават пралезьлі ў камсамол.

* * *

Школа стояла непярэдані выбараў вучкому, ішла актыўная падрыхтоўка, на якую толькі здольны маспацыцыяловыя юнакі.

Чатыры сямнаццацігадовыя хлапчукі, вучні 7-й клясы—Дзянісовіч, Белахвосьцік, Сапрык і Юхневіч, а акрамі іх «другарадная падсобная дробязь»—таксама вялі падрыхтоўку да выбараў узмоцненым тэмпам.

На канспіратыўным сходзе на кватэры аднаго з вучняў быў распрацаваны канкрэтны плян захопу школьнай улады.

— Галоўнае, захапіць сход у свае рукі,—прапанаваў Юхневіч.

— Правільна кажаш,—падтрымаў Сапрык.

А потым парашылі: як толькі адчыніцца сход, кожнаму падаць запіску з аднолькавымі кандыдатамі.

— Кандыдатуры ў вучком абавязкова павінны быць нашы: Юхневіч, Сапрык, Дзянісовіч і г. д.

— Не забудьцеся вызначыць і сваіх шпіёнчыкаў, бо гэта вельмі важна на сходзе.

— А рэзалюцыя па справаздачы ёсьць? — Падрыхтавана, заспакайвалі «атаманы».

З гэтым сход і разыйшоўся. А потым, не без дапамогі настаўніка Ракушова, а таксама ўдзельніка нагромаў 1905 году, слабга саюзу „Гаўрыіла Архангела" Галубовіча гэта група, карыстаючыся тым, што частка іх зьўляліся сябрамі вучкому, склікалі сход на суботу, калі вучні беднаты пашлі даміў за харчамі, а засталіся сыны нестачковых гандляроў і вясковых заможнікаў.

Канспіратыўная нарада дапамагла: у прэзыдыум сходу ўвайшоўшы „свае" хлапцы. Паступіла некалькі запісак, патрабуючы вываду са сходу прадстаўнікоў райкому камсамолу і члегуп камсамольцаў. У рэзалюцыі на справаздачы вучкому зазначылі: «Торкавам у працы вучкому быў фарпост; у школе было двоеўладзьдзе».

З-за таго, што на сходзе прысутнічала ўсяго 50 проц. вучняў, пастанова абвяшчаецца непаўнаважнай і даводзіцца да ведама вучняў, што будзе скліканы другі сход.

Групоўка зьбіраецца на новае насяджэньне, на якім зноў разгледзіць ставіцца пытаньне аб захопе «ў свае рукі» новага сходу.

Агітацыя набывае награжаючыя памеры: на кожным перапынку адны гутаркі аб прадстаячым сходзе, толькі размовы аб будучай бойцы. У ход пушчаецца стары контр-рэвалюцыйны метад—антысэміцкія лістоўкі.

* * *

Я сядзеў у адной з талочынскіх «тасьцініц» і пісаў дарожныя нататкі. У пакойчык увайшлі чатыры хлапчукі, з якіх двух можна было жаніць.

— Вы ня ведаеце, дзе тут знаходзіцца прадстаўнік «Савецкай Беларусі»?

Калі я сказаў, што «ён перад вамі», хлапчукі ажывіліся.

— Вы ведаеце, гэта мы тыя, якіх вюключылі з талочынскай сямігодкі. «Працаўнік Асьветы» ў артыкуле «Завіруха ў Талочынскай сямігодцы» пісаў пра нас... Мы хочам, каб вы дапамаглі нам, каб нас прынялі зноў у школу.

Я выслухаў „студэнтаў бунтароў" і запытаў іх аб сацыяльным становішчы. Маўчаць. Пераглянуліся.

— М-мы... земляробы.—Я сын калектывіста...—А я батрак.

Цім Зарэчны.

Абвяржэньне, шытае белымі ніткамі.

У № «Працаўніка Асьветы» ад 3-га лютага г. г. друкаваўся артыкул «Аршанскія кіты», адным з героеў якога зьяўляецца былы інспэктар нар. асьветы Аршаншчыны Сарокін. Як вядома, інспэктар Сарокін прысланы у рэдакцыю адніску, стараючыся давесьці беспадстаўнасьць гэтага артыкулу па часьці крытыкі яго, Сарокіна, чынасьці на ніве народнай асьветы ў Аршаншчыне.

Усе «абвяргацелі»—на адзін манер, і абвяржэньні іх шыты белымі ніткамі. А таму на сутнасьці абвяржэньня гр. Сарокіна магчыма сказаць наступнае.

Даныя адносна нескарыстаньня сродкаў на простаму прызначэньню на нарасьвету Аршаншчыны раёну (5000 рублёў) узяты былі з апошняга гадавога акту рэвізійнай камісіі, якая, бязумоўна, не магла пісаць хлусьлівых вынікаў. Райінспэктар Сарокін не зацікавіўся, што там было напісана, і таму піша, што нескарыстана усяго 1500 рублёў. Магчыма, гэта тлумачыцца толькі тым, што Сарокін хутка зьмыўся з Аршаншчыны.

Д лей Сарокін кажа, што «ў Аршаншчыне да 15-X працавала ўжо 30 лікпунктаў, а к 15-XII—60". Можа, як кажа Сарокін, па афіцыйных справах яно і так, бо справы знаходзяцца ў інспэктара. Але ў жыцьці яно было інакш, і настаўніцтва на райённай канфэрэнцыі 27-29 сьнежня яскрава гэта адзначыла. У акце рэвкамісіі сказана, што і сёлета кампанія па ліквідацыі правалена. У мінулым годзе, згодна афіцыйнай справаздачы ранейшага інспэктара, выпусьцілі ўсяго 380 асоб і далёка ня выканалі заданьня. Усё настаўніцтва агулам крычала, што лікпункты гібнуць без падручнікаў і пісьмовых прыладаў. Сарокін на гэта маўчаў. Са свайго боку ён абвінавачваў райком партыі і РВК у тым, што яны яму не дапамагалі.

Што датычыцца працы райпэтбюро, то арганізацыя яе і кіраўніцтва—менш за ўсё заслуга Сарокіна. Па палажэньню ён павінен быў быць старшынёй яго, але ўхіліўся ад гэтага, і кіруе справамі бюро выкладчык тэхнікуму т. Палівода, які тыдням па мног знайсьці інспэктара; значны час працавалі нават без паперы. Сарокіну перадалі дзеля накіраваньня па пэрадах канспэкты лекцый і пляны. Яго зацікаўленасьць пашла так далёка, што пляны і канспэкты вусім вярнулі. А над іх складаньнем доўгі час працавалі студэнты тэхнікуму. Часта Сарокін у сярэдзіне насяджэньня вымаў гадзіньнік і казаў: «мне некалі»—партфэль у руцы і ай-да, а насяджэньне канчалі без яго.

Што датычыцца загадваньня Шапаўскай сямігодкай і зьяцьца настаўніка Кышнава, дык у момант пісаньня артыкулу «Аршаншчыскія кіты» ўсё надрукованае намячалася правесьці ў жыцьцё. Але акруга не згадзілася. Магчыма, што перашкодзіў артыкул. Магчыма, навяла страху і прыехаўшая ў той час камісія.

Некалькі слоў аб пісьменнасьці Сарокіна. Хоць БДУ і вельмі паважаная ўстанова, але на Сарокіна яна ўплыву не зрабіла. У сваім абвяржэньні Сарокін піша: „У дадатке", «асветы», «аўтарам», „лікпункты", «неведома», „не маюць", «бюджет», «Белдзержвыдавецтва» і шмат іншых. Адносна знакаў прыпынку і казаць нечага. Відома, такі інспэктар павінен адмовіцца ад пасады па „ўласнаму" жаданьню, як даводзіць гр. Сарокін. Толькі чаму такое жаданьне зьявілася ў сярэдзіне году?

У сваім «абвяржэньні» Сарокін забыўся сказаць, што ён разам з інспэктарствам выкладаў і ў сямігодцы і што вучні на пасяджэньні назвалі яго гастралёрам, бо Сарокін прапускаў лекцыі, а пасьля гнаў ва ўсю. Нічога не сказаў ён і адносна развалу 5-й сямігодкі, у чым яго вялікая віна.

Акрузе ў далейшым трэба добра прыглядацца да тых, каго яна накіроўвае інспэктарамі, каб яны не псавалі справы.

У канды неабходна дадаць, што ёсьць пастанова—усіх вінаватых у злоўжываньнях са сродкамі на нарасьвету перадаць у суд. В—а.

НАМ АДКАЗВАЮЦЬ.

На артыкул «Нагу больш мэтазгодна перасялець («С. Б.» № 47 ад 28 лютага) выканбюро прафсэкцыі БДУ дае наступнае тлумачэньне:

У наступным годзе інтэрнату БДУ на Ленінскай вул. ня будзе, і студэнтаў Мэдфаку трэба было-б зьмясьціць у будынку, які зараз зайнае Беларуская Акадэмія навук на Інтэрнацыянальнай вул., а фізіялягічны, анатамічны інстытуты і анатамічны тэатр будуць зьмешчаны з кастрычніка месяца ў новых будынках Унівэрсытэцкага гарадка, і адлегласьць туды ад інтэрнату на Ленінградзкай вул. будзе значна меншая; тое ж і ў адносінах 1-й сав. больніцы.

Выканбюро, улічваючы перагружанасьць працай студэнтаў Мэдфаку, прыняло пад увагу і стварэньне адзаведных умоў для акадэмправы. Засяленьне якою студэнтамі аднаго факультэту і курсу мае вялікае значэньне для акадэмічных заняткаў.

У інтэрнаце на Ленінградзкай вул. будзе зьмешчана каля 180 чал. студэнтаў, што ў большай меры, на колькасьці жывучых у інтэрнаце, адпавядае Мэдфаку і разьмяшчэньню студэнтаў па факультэтаму прынцыпу, пры заняцьці жывучых у інтэрнаце студ. Мэдфаку 220 і Праў асу 131 чал., а Мэдфаку 170 чал. Калі згадзіцца з аўтарам артыкулу, трэба было-б зьмясьціць у інтэрнат студэнтаў розных факультэтаў, што ў значнай меры перашкаджае і правядзеньню культыхавацкай працы адзаведнымі прафкомамі.

На артыкул «Ягадкі вячуцьцяў Лепатухіна» («Сав. Бел.» № 199 за 30 жніўня 28 г.) Інспэктура па сацыяльнаму выхаванню НКА паведамляе наступнае:

У пачатку 1927-28 нав. году, з прычыны недахопу адзаведнага ліку настаўнікаў і кіраўнікоў станоўішча Радзіванскай 7-мігодкі, настаўніцы гэтай школы Жураўлёвай было дадзена 10 тыдзёвых гадзін працы ў IУ раўналегляй групе, а ў старэйшым канцэнтры была дадзена ёй расейская мова, прыродазнаўства і малявальне, наогул яна атрымала нагрузку -ў 31 гадзіну працы ў тыдзень. Нагрузку гэту Жураўлёва зічыла заняткай і адмаўлялася ад 10 гадзін працы, дадзеных ёй у IУ групе. З такою нагрузкаю Жураўлёва працавала ўвесь першы трымэстр. У пачатку зімовага перамыку т. Лепятухіным (загадч. школы) было ўзьнята пытаньне аб разгрузцы Жураўлёвай, і 15 студзеня ад не былі ўзяты і перададзены Рыжковай з IУ групы 4 гадзіны расейскай мовы і 2 гадзіны графіку. Разгрузка Жураўлёвай навіна была быць зроблена, але не трэ' было прабіць значна раней.

За несвоечасовае разьвязваньне пытаньня па разьмеркам ніяк паміж настаўнікамі лекцыяў загадчыку школы Лепятухіну Магілёўскі акруговы інспэктарыят арабіў вымову, і на яго кошт адасобны выдаткі, якія выліканы з прычыны несвоечасовага разьмеркаваньня лекцыяў паміж настаўнікамі. Райённаму інспэктару нарасьвету т. Шчарбінскаму за несвоечасовае рэагаваньне на гэтаму пытаньню абвешчана вымова з агалашэньнем у друку.

Наша перапіска.

А. Лесному. Магілёў. Ваш допіс «Магілёўская прафшкола патрабуе аздараўленьня» пераслалі ў Наркамасьветы.

Вашкевічу. Слуцак. Наконт вашага допісу «Сыны і пасынкі» Наркамасьветы тлумачыць, што „разьвастайнасьць у стыпендыях ёсьць, але на гэта ёсьць адзаведныя пастановы Савнаркому".

Зубастаму. Чэрэйскі р., Абгуга. Пераслалі ў Аршанскае акр. праўленьне самому працасьветы.

Матле. С.-Гарадок. Допіс „Сёмкава-Гарадзецкія хуліганы" пераслалі ў Мен. акр. міліцыю.

Г. Палею і М. Лосіму. Дукора. Пераслалі ў Менскую акр. інспэктару нар. асьветы.

НАПЯРЭДАДНІ ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ.

Прыкладная падрыхтоўка да сяўбы.

(Клімавіцкі р-н, Магілеўшчына).

Падрыхтоўка да вясеньняй пасеўнай кампаніі ў райёне распачалася ў лістападзе 1928 г. і зараз знаходзіцца ў поўным разгары.

К сучаснаму моманту па райёну працуе 8 перасовачных зернаачышчальных абозаў, якія яшчэ на 15 лютага адсартыравалі селянскага збожжа—40 проц. намечанага па пляну заданьня (намечана па пляну адсартыраваць—1180 тон, адсартырована —472 т.). Зернаачышчальныя машыны маюць поўную нагрузку, ёсьць поўная надзея выканаць намечаны плян зернаачышчэньня з павялічэньнем. Заўважана шмат выпадкаў у райёне, калі насельніцтва вёсак прымае 100 проц. ачыстку збожжа. Як недахоп у працы зернаачышчэньня трэба адзначыць значную недастачу ільняных трашчотак (маецца 5, не хапае—4), у зьвязку з чым ачыстка ільна-насеньня не ахоплівае поўнасьцю патрэб насельніцтва.

Для агранамізацыі селянства і для азнаямленьня яго з пастановамі ўраду аб падвышэньні ўраджайнасьці— аграпрацаўнікамі райёну і актывам вёскі праводзіцца шырокая растлумачыцельная кампанія, шляхам чыткі лекцый, гутарак, канфэрэнцый і правядзеньня с.-г. курсаў. К сучаснаму моманту ў райёне праведзена 3 кароткатэрміновых с.-г. курсаў у земляўпарадкаваных пасёлках і на працягу сакавіка месяца мяркуецца правесьці 4 больш працяглых с.-г. курсаў для ўпаўнаважаных калгасаў, пасёлкаў і вясковага актыву. Курсамі будзе ўдзеляна значная ўвага жывёлагадоўлі і інш. спэц. галінам сельскай гаспадаркі.

Мясцовыя загатоўкі пасеўматэр'ялу па аўсу, ячменю, грэчцы і віке праходзяць здавальняюча. На 15-е лютага плян загатовак па гэтых культурах выканан на 86,6 проц. намечанага пляну —353 тоны, выканана—306 тон, апрача нарыхтованага ўжо насеньня па лініі КСУ (тых-жа культур), якога да сучаснага моманту маецца 105 тон. Што-ж датычыцца насеньня: кашюшыны, лубіну і лёну-даўгунцу, то загатоўка іх будзе залежыць ад завозу з замежаў райёну, бо на мейсцы гэтае насеньне загатаваць нельга за адсутнасьцю.

На раду з забесьпячэньнем пасьпяховасьці правядзеньня прадстоячай пасеўкампаніі галоўная ўвага зварачваецца на арганізацыю калгасаў і пачатковых с.-г. аб'яднаньняў. Па гадоваму пляну намечана да арганізацыі 8 калгасаў і 19 пачатковых с.-г. аб'яднаньняў. К сучаснаму моманту арганізавана:—5 калгасаў (з якіх 4 у стадыі афармленьня), 3 машынныя т-вы, 2 насеннаводныя т-вы і 1 малочнае т-ва. Да канца вызначанага тэрміну мяркуецца арганізаваць усе калгасы і ўсе с.-г. аб'яднаньні.

У мэтах завастрэньня ўвагі да прадстаячай пасеўкампаніі, а роўна ў мэтах найвялікшага ўцягненьня ўсіх актыўных сіл вёскі ў гэту працу—апошні пленум РВК даў адпаведныя дырэктывы ўсім савецкім і грамадзкім установам райёну, з шэрагам практычных мерапрыемстваў у гэтай галіне.

Асмалоўскі.

Вясну сустрэнем падрыхтаванымі.

(С.-Германаўскі с-с., Глускага райёну, Бабруйшчына).

С-Германаўскім с-с. распачата шырокая падрыхтоўчая праца да правядзеньня веснавой пасяўной кампаніі. Выпрацаваны плян правядзеньня гэтай кампаніі па с-с. Плян складаўся на грунце райённага пляну, таксама выходзячы з мясцовых умоў с-с. Галоўная ўвага зьвернута на збожжавычышчэньне, загатоўку насеньня, ажыўленьне працы поваўрганізаваных калгасаў і аказаньні дапамогі беднаце. Даручана старшыням калгасаў (а іх 2 у райёне с-с) зараз-жа распачаць нарыхтоўку с-гаспадарчага інвэнтару да веснавых работ, загатовіць насеньне і своечасова атрымаць належныя крэдыты. У с.с дастаўлен «Трыер» для ачысткі насеньня.

Сумесна з камітэтам узаемадапамогі складзены плян збожжавычышчэньня с-с., для таго, што-б „Трыер" працаваў бесперабойна і зноў больш ачысьціць насеньня. Ужо ачышчана 900 пудоў збожжа. (На пляну мяркуецца ачысьціць 2000 п.). Камітэтам узаемадапамогі праводзіцца праца па ўзысканьню сяброўскіх узносаў і недоімкі мінулых гадоў, што-б нарыхтаваць сродкі да пасяўной кампаніі. Выяўлены бяднацкія гаспадаркі на с.-с., якім патрэбна насеньне і с-гасп. машыны, сьпіс на якія накіраваны ў Райвыканком.

Камітэт узаемадапамогі за свае сродкі ўжо загатовіў 200 пудоў розпага насеньня для беднаты. Па пляну сіламі к-ту ўз-гі будзе аказана гужавая дапамога 15 самым бяднацкім гаспадаркам. Таксама для гэтай мэты будзе праведзены грамадзкімі сіламі адзін нядзельнік.

Праводзіцца праца спрод сялянства па падрыхтоўцы с.-гаспадарчага інвэнтару, аб парадку адтрыманьня крэдытаў і ўгнаеньняў. У падрыхтоўчай працы прымаюць актыўны ўдзел ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМБ, настаўнікі, ліквідатары і ўсе іншыя мясцовыя арганізацыі. Насельніцтву растлумачваецца пастанова СНК СССР і БССР аб падвышэньні ўраджайнасьці.

Будзе праведзены конкурс на лепшую гаспадарку па правядзеньню веснавой пасяўной кампаніі, якой будзе вызначана прэмія. Па пляну ў с.-с. будзе закладзена 3 паказацельныя вучасткі (2 у сялянскіх гаспадарках і 1 у калгасе). Таксама сіламі дэлегацкага сходу будзе закладзены адзін паказальны гарод. Камітэту ўзаемадапамогі даручана абсемяніць свой зямельны вучастак у разьмеры 2 гектары.

Падрыхтоўчая праца да вясны ў нашым с-с. у поўным разгары. Усе тыя мерапрыемствы, якія вызначаны ў пляне будуць праведзены ў жыцьцё. Кепска толькі тое, што ў наш с-с. ніколі не заглядае агранам. Трэба, каб у часе веснавой пасяўной кампаніі мы яго пабачылі і атрымалі належную дапамогу ў часе гэтай важнай палітычнай і гаспадарчай кампаніі. А. Ганчароў.

Рыхтуемся, але слаба.

(Камянецкі с.-с., Вузьдзенскага р-ну, Меншчына).

Пытаньне веснавой сяўбы, надыходзе ўраджайнасьці і калектывізацыі прапрацавана на групах і сходах беднаты і агульных сходах аналь усіх вёсак. Растлумачальная кампанія праведзена аналь поўнасьцю.

Але справа практычна аналь не на месцы. Ня гледзячы на наліччa зернаачышчальнага абозу, які ўжо месяц разьязджае па вёсках, зернаачышчэньне вельмі марудна пасоўваецца наперад. Сельсавету дадзена заданьне ачысьціць 70 тон збожжа, а зараз ачышчана толькі 7, тады, як большасьць вёсак у часе неразьбарчай кампаніі прынялі пастановы аб увядзеньні агрыкультурнага мінімуму.

Слабая падрыхтоўка вядзецца і з боку КСУ ў напрамку забясьпечаньня беднаты насеньнем. У КСУ маецца 60 пудоў збожжа, лічба вусім недастаткова. Зроблен заказ на куплю яшчэ 200 пуд. Лепш пастаўлена справа калектывізацыі. Арганізавана адна с.-г. арцель на сялянскіх землях і адна на зямлі запфонду. Справа калектывізацыі—тэма сёньнешніх гутарак сялянства. М. Г.

Абыходзяцца гаварыльняй.

Кузьмініцкі с.-с., Церахоўскага р., Гомельскай акр.).

Аб ачысткі насеньня ў сваім сельсавеце Кузьмініцкая ячэйка КП(б)Б ставіць пытаньне на парадку дня яшчэ з восені, але справа аналь ні на крок не пасоўваецца наперад. А ўмовы для гэтага ў Кузьмініцкім с.-с. найлепшыя: пры камітэце ўзаемадапамогі маюцца яшчэ з восені такія машыны, як «Трыер» і льнотрашчотка і зараз яшчэ набыта сартыроўка.

Апрача таго ў адлегласьці адной вярсты на пасёлку «Чырвоны Кавсава вытрыманым, і ні ў якім разе нельга дапушчаць такіх апавяданьняў, дзе, хоць і мастацкі, перадаецца дзецям чорная народная сіла розных забабонаў, якія накідаюць на сабе цяжкае ўражаньне ў чытача зараз пасьля чытаньня, а іншы раз нават захоўваючы гэта ўражаньне на ўсё жыцьцё.

Для чытачоў 11—12 год,—вучняў другой паловы першага канцэнтру—я параіў-бы чытаць таксама казкі і апавяданьні з дзіцячага жыцьця, больш складаныя па форме і зьместу, уводзячы сюды элементы мастацкае літаратуры, бязумоўна, прыстасаванай да дзіцячага ўзросту і разуменьня. Поруч з гэтым я лічу мэтазгодным уключыць сюды апавяданьні з жыцьця жывёлы, расьлін і наогул апавяданьні прыродагеаграфічнага характару, просьценькія па форме і ня надта замыславатыя па зьместу.

Зразумела, што піводная кніжка, невядомая па зьместу настаўніку і ня ўхваленая ім, ня можа быць дадзена на рукі вучню для чытаньня.

Пры нармальнай, правільнай пастаноўцы пазакласнага чытаньня настаўнік зможа праводзіць сталы нагляд за разьвіцьцём у дзіцяці запраўднага літаратурнага густу, у які дзіця павінна ўваходзіць зараз-жа пасьля першага прачытанае кніжкі.

Зразумела, што каб усё ішло гладка і было добра, настаўнік павінан весьці з дзіцьмі гутаркі і перад выдачай кніжак, дзеля ацэнкі агульнага разьвіцьця сваіх чытачоў і ўяўленьня індывідуальных асаблівасьцяў пасобных вучняў; тое самае ён павінен рабіць і пры звароце кніжак дзіцьмі назад дзеля выяўленьня—якое ўражаньне зрабіла кніжка на чытача. Ня шкодна складзі грамадзкую думку наконт каштоўнасьці тэй ці іншай кніжкі на падставе абмену ўражаньнямі па прачытаным.

Тут настаўнік можа назіраць вучнёўскую зацікаўленасьць да літаратуры, вывяўць крытычныя адносіны да кніжкі з боку дзяцей і бачыць,—як больш моцныя вучні будуць рабіць уплыў на слабейшых і дапамагаць ім разьбірацца.

Злачынна спалі.

(Плешчаніцы, Меншчына).

Прэзыдыум райвыканкому побач з заслухоўваньнем дакладу аб падрыхтоўцы с.-г. крэдытнага т-ва да вясеньняй пасеўнай кампаніі заслухаў вынікі абсьледваньня працы РКСТУ.

РКСТУ гэтым пытаньнем ня цікавіўся, нават не ставіў на пасяджэньнях прэзыдыуму, якіх, да слова сказаць, ніколі ня бывае, бо старшыня падбірае пытаньні, піша пратаколы, а сябры прэзыдыуму прыходзяць, або старшыня да іх нясе падпісваць.

Разданую семсуду ў мінулым годзе ня зьбіралі (замест 400 пуд. сабралі 350 п.). Сяброўскія ўзносы і запазычанасьць мінулых гадоў ня ўзыскваецца і няма вучоту па сельСТУ.

Ачыстка насеньня не праходзіць і машын для гэтай працы няма, акрамя трох паламаных вялак, якія ня ўжываюцца. Кіраўніцтва в боку РКСТУ сельскімі камітэтамі ня было. Старшыня РКСТУ зьяўляўся перапісчыкам па сабезаўскіх справах, якія сакратар РВК яму накіроўваў.

Райвыканком детальна разглядзеў увесь матар'ял і перадаў пракурору для прыцягненьня да адказнасьці вінаватых.

А. Вольман.

Разумнае кіраваньне пазакласным чытаньнем вучняў —ЗАДАЧА ШКОЛЫ І НАСТАЎНІКА.*)

У наш час пытаньне дзівячага чытаньня становіцца актуальным. Аб гэтым гавораць на зьездах сацвыху, на розных настаўніцкіх сходах і канфэрэнцыях, аб гэтым пачынаюць гутарыць на падрадах, на старонках газет і педагагічных часопісях.

Адно, што ўжо стала бясспрэчным і відавочным, дык гэта тое, што дзеці лавінны чытаць кнігі, што толькі праз кнігі дзіцянё-падлетак хутчэй і лепш пазнаёміцца з акаляючым жыцьцём і разьбярэцца ў ім.

Жыцьцё, вырашыўшы станоўча пытаньне аб патрэбнасьці чытаньня кніжак дзяцьмі, пакінула да сучаснага моманту адкрытым, ня вырашаным другое пытаньне:—„Што-ж чытаць дзецям з літаратуры, чытаньне якой літаратуры будзе дзеля іх карысным, а якое шкадлівым, нават пры ўмове, калі мы, настаўнікі, будзем памятаць асаблівасьці выразнасьці мяжы паміж псыхічным жыцьцём дзіцяці і дарослага чалавека, бо забыўшыся пра апошнае, або не зьвярнуўшы належнай увагі на гэта пытаньне—што чытаць дзецям набывае яшчэ большую складанасьць.

На псыхічнае разьнежаваньне паміж дзецьмі і дарослымі, а таксама на асаблівасьці дзіцячага інтэлектуальнага разьвіцьця зварочваецца мала увагі ня толькі звычайнымі педагогамі, настаўнікамі па школах, дзе на іх вырашэньне ўскладаецца ляжар разьвязкі пазакласнага чытаньня вучняў, але не заўсёды дастаткова аддаецца ўвагі нават і тымі настаўнікамі, якія бяруць на сябе гонар абгавору і разьвязкі праблемы пазакласнага чытаньня ў педагагічнай прэсе.

Вось чым я тлумачу тое, што замест вырашэньня пытаньня,—што чытаць дзецям,—яно пакуль што не разьвязваецца, а можа і заблытваецца.

Возьмем дзеля прыкладу ў № 7 часопісі „Асьвета" артыкул настаўніка Р., дзе ён, паставіўшы пытаньне „Аб арганізацыі пазакласнага чытаньня", замест адказу—што чытаць дзецям—аб чыт гутарку вядзе ў „агульных» рысах, падмяніў ня вусім удала пытаньнем як чытаць (праўда, з уласнае практыкі), і гэтым самым ня толькі не дапамог у вырашэньні паставленага ім пытаньня, а нездарот—пакінуў свайго чытача ў поўным нведаньні і старой блазвыхадзнасьці.

Я ня буду ўступаць з тав. Р. у спрэчкі па сутнасьці яго артыкулу, бо ў тых частках, дзе разважаньні носяць агульны характар, аўтар адчувае сабе ў родным стыхіі, і не згадзіцца з ім і яго довадамі і пажаданьнямі нельга.

Напрыклад, ён кажа, што настаўнік павінен разьвіць у выхоўваемых дзецях патрэбу да добрых і карысных кніжак, пашырыць сярод вучняў чытаньне навукова-папулярнае і мастацкае літаратуры (надзвычайна патрэбна), выкрыць у вучня тыя ці іншыя здольнасьці, або нахілы ў пасобных галінах навукі і ў вязку з гэтым падкаваць вучня адпаведнай літаратурай, або кажа далей, што настаўнік павінен скласьці сьпіс «рэкамендаваных» кніг дзеля дзіцячага чытаньня і пазнаёміць дзяцей з мэтадам чытаньня і г. д.

Усё гэта пры некаторых «прыватнасьцях» і патрэбна і карысна, і мэтазгодна. Але ў тэй частцы артыкулы, дзе т. Р. пераходзіць да «практычных вываду» і ўносіць рэцэптуру, дык прыходзіцца часам разьвесьці рукамі ад яго практычных прапазіцый.

Вось дзеля характарыстыкі, як кажа сам аўтар, яго «пяроўная, але даволі лёгкая, такая, што не патрабуе ад вучня шмат часу, схема» вучоту прачытанага ў 5 і 6 кл. сямёхгодкі:

1. «Аўтар і загаловак твору» (зразумела кожнаму).

2. «Кароткі зьмест ці плян твору». Па-першае, зьмест ці плян твору—гэта ня тое самае, а па-другое, даць зьмест хоць і «кароткі» ня так проста, асабліва, калі настаўнік не прывучыў дзяцей да гэтага, на што трэба затраціць значную колькасьць часу і настаўніку і вучням.

3. «Асноўная ідэя». Тут-то ўжо напэўне, будзе і «проста», і «лёгка» вучню, бо сам настаўнік ня заўжды ў творы знойдзе асноўную ідэю і зможа яе выдзеліць.

4. «Галоўныя дзеючыя асобы і іх характарыстычныя рысы». Няўжо-ж т. Р. да гэтага часу яшчэ не заўважыў, што вучні нават 7, 8 і 9 груп нашых школ, жаль, ня ўмеюць даваць характарыстыкі літаратурных твораў ужо разабраных твораў, а патрабаваць характэрных рыс дзеючых асоб твору ад вучня 5 і 6 груп, прачытаўшых твор наскокам, нясур'ёзна і некарысна.

5. «Цікавыя ў творы месцы з боку зьместу ці формы, а таксама найбольш удалыя і трапныя выразы і словы».

Тут мне здаецца, што аўтар абсалютна забыўся, з кім ён мае справу. Зьмест і форма іх асаблівасьці патрабуюць ад настаўніка ўпартае і сыстэматычнае працы з вучнямі над уясьненьнем гэтага. Толькі тады, калі гэта мела месца, магчыма патрабаваць ад вучня таго, што яму падсоўвае дзеля адказу зараз-жа т. Р. Шкода, што дзеля ілюстрацыі аўтар ня прывёў у сваім артыкуле апісанага вучнёўкага адказу на сваю «лёгкую» „пяноўную" схему-анкету.

6) «Незразумелыя в «разы і словы» «Вось гэтае самое вразумелае, уключаючы сюды §1, са ўсе яго схемы на што вучні дадуць належны адказ.

Такім чынам, з напісанага вышэй відаць, што „лёгкая» „пяноўная" схема пямнога дасьць карыснага ў сэнсе «арганізацыі пазакласнага чытаньня і што яна з посьпехам можа быць скарыстана ў навучальных установах вышэйстаячых над сямігодкаю, а не ў самой сямігодцы, асабліва ў 6 і 5 групах як, як гэта практыкаваў т. Р., невядома, праўда, з якім посьпехам і вынікамі.

Кожны скажа, што наводзіць крытыку на другога лягчэй, чым узяцца за працу самому.

На гэта я спрабую адказаць наступнай ісьцінай, вядомай кожнаму педагогу: нашы дзеці павінны чытаць цікавае і карыснае. Вось чаму даваць агульны рацэпт на запытаньне—што чытаць дзецям—непатрэбна.

Па-мойму, будзе карысным і мэтазгодным разьбіць дзяцей у пазашкольным чытаньні наступным парадкам: 8—10 год, 11—12 год, 13—14 г. і далей. Зразумела, што гэтым падзелам справа пазашкольнага чытаньня канчаткова ня будзе вырашана, бо ўзрост па гадох ня заўжды аднолькава можа быць зьвязаны з інтэлектуальным разьвіцьцём дзіцяці. Але-ж па-мойму, дапушчаная памылка в гэтага боку ня будзе надта вялікай, бо дзеля большасьці стане адпавядаючай, а выключэньні калі яны будуць мець месца, застануцца толькі выключэньнямі.

Такі падзел я маю на ўвазе яшчэ і таму, што ён звязваецца з ростам дзіцячага разьвіцьця на адпаведных групах навучаньня ў школе: 8—10 г. гэта 1 і 2 групы, 11—12 год— 3 і 4 гр., а 13 і 14 г. ідалей--другі канцэнтр. Праўда, самастойнае чытаньне кніжак з бібліятэкі ўнясе надзвычайную складанасьць і пры напярэдні падзеле, бо настаўнік, кіраўнік пазакласным чытаньнем, павінен блізка, усебакова ведаць свайго вучня-чытача, якому будзе выдаваць патрэбную па яго думцы кніжку. Настаўніку абавязкова патрэбна ведаць усе індывідуальныя асаблівасьці і сьвяжпогляд кожнага чытача-вучня.

Гэтая складанасьць крыху спрашчаецца тым, што ў малодшых клясах настаўнік вучня—ён-жа кіраўнік-выхавацель клясы, які мае справу з клясай штодня ня менш аднаго навучальнага году, тэрмін досыць значны, каб блізка пазнаёміцца і вывучыць усе асаблівасьці складу натуры і разьвіцьця свайго вучня.

Зразумела, што тое апавяданьне, у якім багата фантазіі, якое багата і добра ілюстравана, будзе больш захапляць дзяцей і цікавіць іх, чым апавяданьні, бедныя фантазіяй і бяз добрых ілюстрацый. Апавяданьні багатымі фантазіяй і цікавымі для дзяцей, асабліва на першых кроках пры ўладаньні тэхнікай чытаньня, зьяўляюцца казкі. Ні ў якім разе нельга думаць, што ўсе казкі адналькава карысны дзецям. Груба-фантастычныя казкі вусім непрыгодны для дзяцей, і ім не павінна быць месца ў дзіцячай бібліятэцы. Толькі казкі бытавыя і казкі аб жывёлінах могуць мець месца ў дзіцячым абіходзе, і толькі тыя, якія маюць добрую апрацоўку, добра ілюстраваныя, могуць стаць праваднікам ідэі клясавага выхаваньня і зьявяцца моцным здаровым матар'ялам у грунце матар'ялістычнага выхаваньня. Такія казкі будуць мець уплыў на толькі на разьвіцьцё дзіцячае фантазіі, але і на разьвіцьцё камуністычнае маралі, а некаторыя з іх будуць і навукова каштоўнымі. Вось чаму дзіцянё, якое будзе чытаць памянёныя вышэй казкі, праз чытаньне казак будзе падпадаць пад станоўчы пэдагагічна-выхаваўчы ўплыў.

Усе казкі міфалёгічнага зьместу, якія параджаюць рамантычныя настроі, а таксама, казкі і апавяданьні, якія наводзяць страх на дзяцей, палохаюць іх і гэтым перашкаджаюць нармальнаму псыхалёгічнаму разьвіцьцю дзіцяці, таксама не павінны мець месца ў дзіцячай бібліятэцы, а калі і трапілі туды, дык павінны быць выкінуты, як шкодныя.

Поруч з казкамі, для чытачоў 8—10 год можна ўводзіць апавяданьні з дзіцячага жыцьця, але такія, якія працягвалі-б працу казак. Апавяданьні, бязумоўна, павінны быць лёгкімі па складу і простымі па зьместу. Апавяданьне абавязкова павінна быць клясавым вытрыманым, і ні ў якім разе нельга дапушчаць такіх апавяданьняў, дзе, хоць і мастацкі, перадаецца дзецям чорная народная сіла розных забабонаў, якія накідаюць на сабе цяжкае ўражаньне ў чытача зараз пасьля чытаньня, а іншы раз нават захоўваючы гэта ўражаньне на ўсё жыцьцё.

Для чытачоў 11—12 год,—вучняў другой паловы першага канцэнтру—я параіў-бы чытаць таксама казкі і апавяданьні з дзіцячага жыцьця, больш складаныя па форме і зьместу, уводзячы сюды элементы мастацкае літаратуры, бязумоўна, прыстасаванай да дзіцячага ўзросту і разуменьня. Поруч з гэтым я лічу мэтазгодным уключыць сюды апавяданьні з жыцьця жывёлы

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб правядзеньні ў жыцьцё пастановы Прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР па дакладу аб папярэдніх выніках выбарчай кампаніі ў Саюзе ССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Даручыць Цэнтральнай і акруговым выбарчым камісіям перагледзіць сьпісы асоб, якія пазбаўлены выбарчых правоў, і заявы аб адноўленьні ў выбарчых правах і выправіць усе парушэньні выбарчай інструкцыі, якія былі дапушчаны.

2. Даручыць Цэнтральнай Выбарчай Камісіі даць паказаньні мясцом аб тым, што ўсе законныя абмежаваньні, якія вынікаюць з пазбаўленьня выбарчых правоў, павінны ўжывацца толькі пасьля канчатковага вырашэньня справы аб пазбаўленьні выбарчых правоў вышэйшымі органамі.

3. Даручыць Цэнтральнай Выбарчай Камісіі распрацаваць пытаньне аб удасканаленьні вучоту і хаваньня мясцовымі органамі сьпісаў і дакумэнтаў на асоб, якія пазбаўлены выбарчых правоў.

4. Заслухаць праз месяц даклад Цэнтральнай Выбарчай Камісіі аб выкананьні гэтае пастановы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. Ігнатоўскі.

9-га сакавіка 1929 г.
г. Менск.

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР.

о проведении в жизнь постановления президиума ЦИК Союза ССР по докладу о предварительных итогах избирательной кампании в Союзе ССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:

1. Поручить Центральной и окружным избирательным комиссиям пересмотреть списки лиц, лишенных избирательных прав и заявления о восстановлении в избирательных правах и исправить все допущенные нарушения избирательной инструкции.

2. Поручить Центральной избирательной комиссии дать указания местам, что все законные ограничения, вытекающие из лишения избирательных прав, должны применяться только после окончательного разрешения дела о лишении избирательных прав высшими органами.

3. Поручить Центральной Избирательной Комиссии разработать вопрос об уточнении учета и хранения местными органами списков и документов на лиц лишенных избирательных прав.

4. Заслушать через месяц доклад Центральной Избирательной Комиссии о выполнении настоящего постановления.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

За Секретаря Центрального Исполнительного Комитета БССР В. Игнатовский.

9-го марта 1929 г.,
г. Минск.

ЧЫРВОНАЯ ВАРТА.

За ўзьняцьце ўраджаю.

(Н-скі Чырвонаштандартны стр. полк).

У сувязі з надыходзячай вясеньняй пасеўнай кампаніяй, у палку на падразьдзяленьнях у часе палітгадзін праведзены гутаркі сярод чырвонаармейцаў аб задачах пасеўнай кампаніі і аб новым законе па сельска-гаспадарчаму падатку, таксама заслухан даклад на агульным сходзе камсамольскай арганізацыі. Па гэтаму пытаньню намечаны наступныя практычныя мерапрыемствы: арганізаваць у ленкутках вечары, прысьвечаныя ўзьдыму ўраджайнасьці, правесьці сходы з сяброўнымі арганізацыямі па пытаньні падняцьця ўраджайнасьці, зрабіць вылазку чырвонаармейцаў в садружнымі арганізацыямі ў прыгарадныя вёскі, якім дапамагчы ў справе ачыстцы насеньня, разам з гэтым наладзіць масавы вечар ураджаю ў вёсках, палітсуд над гаспадаром, які дрэнна вядзе сваю гаспадарку, і арганізаваць экскурсіі супольна з садружнымі арганізацыямі ў с-гаспадарчы тэхнікум.

Янка Лашкевіч.

Дапрызыўная падрыхтоўка высоўвае грамадзкіх працаўнікоў.

У часе дапрызыўнае падрыхтоўкі на Благавічанскім дапрызыўным пункце было сабрана 45 чалавек дапрызыўнікаў. Дапрызыўнікі пабылі на пункце паўтара месяцы і за гэты час зрабіліся зусім іншымі людзьмі—актыўнымі грамадзкімі працаўнікамі. Сярод дапрызыўнікаў разам з вучобай была разгорнута і грамадзка-выхаваўчая праца. На пункце існавалі гурткі вайскораў, спартыўны, мастацка-драматычны і гурток ліквідацыі няпісьменнасьці. Дапрызыўнікі прымалі актыўны ўдзел ва ўсіх гурткох, прычым 20 чалавек ліквідавалі сваю няпісьменнасьць. На пункце таксама выпускалася сіламі дапрызыўнікаў насьценная газэта, якая падрыхтавала дапрызыўнікаў да ўдзелу ва ўсіх кампаніях. Пасьля сканчэньня вучобы дапрызыўнікі ў сваіх вёсках прымалі актыўны ўдзел у перавыбарах сельсаветаў, а таксама і ў пасяўной кампаніі.

Чэмаданаў.

Узмацнім працу ТДА-Авіахіму.

З 15 лютага пачаліся перавыбары ячэек ТДА-Авіахіму, якія працягнуцца да 10 сакавіка. Справаздачная кампанія і перавыбары праходзяць пад лёзунгам павялічэньня шэрагаў ТДА-Авіахіму, ажыўленьня працы ўсіх існуючых гурткоў пры ячэйках і аб падрыхтоўцы шэрагаў ТДА-Авіахіму да вясеньняе слёты. Да перавыбараў ячэйкі прымаюць захады да абсталяваньня выставак, куткоў і выпуску насьценгазэт, прысьвечаных ваенізацыі шырокіх колаў насельніцтва.

Райсаветам падпісан дагавор з адзяленьнем БДВ аб водпуску для ячэек у крэдыт належнай колькасьці вайсковай літаратуры, якая будзе распаўсюджвацца сярод членаў ТДА-Авіахіму. З папярэдніх справаздач ячэек выявілася, што праца пакуль вялася кампанейскім парадкам, слаба згуртавана грамадзкасьць вакол пытаньня ваенізацыі, зьвяшчы наўплаты сяброўскіх узносаў і ненаведваньне гурткоў. У час перавыбараў таксама намечана ўцягнуць у бюро ячэек больш беднаты, батрацтва і забясьпечыць бюро ня менш, як 20-25 проц. жанчынамі.

Райканфэрэнцыя адбудзецца 17 сакавіка.

Я. Крушына.

Слова за райённым саветам.

(Чавусы, Магілеўшчына).

У Чавускім райёне ёсьць шмат ячэек ТДА-Авіахіму, а працы іх ня відаць. Сяброўскія ўзносы ня выбіраюцца, а таксама не вядзецца праца па ўцягненьні новых сяброў у ТДА-Авіахім. Прычынай усяму гэтаму—райённы савет ТДА-Авіахіму, бо ў яго няма ні марак, ні сяброўскіх білетаў. Калі запытаешся ці хутка будуць маркі і білеты, дык у райёне адказваюць.—Хутка будуць. Але гэта «хутка» ужо цягнецца чатыры месяцы і ячэйкі ТДА-Авіахіму ніяк ня могуць дачакацца.

Андрэй Бязымённы.

ХРОНІКА.

Конкурс на праэкт помніка У. І. Леніну ў Менску.

Пры Галоўмастацтве НКА была склікана нарада для абгаварэньня ўмоў конкурсу на складаньне праэкту помніка У. І. Леніну.

Нарада выказалася за тое, каб прадстаўлены праэкт быў ня меней 1/30 натуральнай велічыні. Дзеля прыцягненьня высока кваліфікаваных сіл у саго Саюзу нарада лічыць неабходным устанавіць досыць высокія прэміяльныя стаўкі: у 3000, 2500, 2000, 1500 і 1000 р.

Тэрмін прадстаўленьня праэктаў на конкурс вызначан да 15 кастрычніка 1929 г. У дзень сьвята Кастрычнікавай рэвалюцыі 7 лістапада ў Менску будзе нала джана выстаўка праэктаў.

Помнік будзе пабудаваны на Пляцу Волі.

АМЭРЫКАНСКІЯ РАБОЧЫЯ Ў МЕНСКУ.

Дэлегацыя амэрыканскіх рабочых у суботу, 9 сакавіка, была ў Белдзяржтэатры на пастаноўцы «Перамога».

10 сакавіка зранку амэрыканскія рабочыя наведалі Старшыню ЦСПСБ тав. Рыжова і гутарылі па ўсіх пытаньнях прафэсійнага руху і аб становішчы рабочых. Правялі дэлегаты гутарку і в старшынёй ВСНГБ т. Карпам аб становішчы і пэрспэктывах беларускай прамысловасьці.

Увечары дэлегацыя амэрыканскіх рабочых была ў клюбе Леніна, дзе сьвяткавалася арганізацыя дзяржаўнага яўрэйскага хору-студыі. Адзін з членаў дэлегацыі выступіў з гарачым прывітаньнем менскіх рабочых.

Учора дэлегацыя наведала Наркамасьветы і Беларускую Акадэмію Навук, увечары дэлегацыя была на вечары ў «Культуры» па запрашэньню рабочых Меншвею і ў клюбе Леніна, дзе была наладжана сустрэча амэрыканскіх рабочых з рабочымі менскіх фабрык і заводаў.

Сёньня дэлегацыя прыйшла ўдзел у працы Пленуму ЦСПСБ, пасьля чаго выяжджае праз Польшчу ў Амэрыку.

КАЛЕКТЫЎНАЯ ЗДАЧА ХЛЕБА ПАШЫРАЕЦЦА.

Паводле вестак Менскай Акруговай Інспэкцыі Гандлю, у Койданаўскім, Самахвалавіцкім і Пухавіцкім раёнах, Менскай акругі, спажывецкая кааперацыя пад кіраўніцтвам раённых арганізацый і пры падтрыманьні бяднацка-сярэдняцкіх гаспадарак наладзіла калектыўную здачу сялянствам хлеба ў кааперацыю. Так, за 11 сакавіка такім чынам здадзена ўжо некалькі тысяч пудоў хлеба.

Сялянства іншых раёнаў Меншчыны таксама падрыхтоўвае калектыўную здачу хлеба.

Народны Камісарыят Гандлю БССР прызнаў неабходным узмацніць забесьпячэньне дэфіцытнымі таварамі тых раёнаў, дзе праходзіць калектыўная здача хлеба. Дзеля чаго запрапанавана Скурсындыкату зараз-жа выдзеліць у распараджэньне Менскай Акруговай Інспэкцыі Гандлю звыш плянаў 60 пуд. падашвы; апрача таго запрапанавана Белсельсаюзу адпусьціць паўвагона жалеза і тэкстыльсындыкату 40 кіп бавоўнянай мануфактуры.

Наркамгандлю даў дырэктывы, каб адпушчаныя прамтавары былі накіраваны ў раёны, дзе праходзіць калектыўная здача хлеба.

Удзел прафсаюзаў у кампаніі ашчаднасьці.

Прэзыдыум ЦСПСБ даў дырэктыву прафсаюзам узяць курс на ўцягненьне ў ашчадныя касы да 1 красавіка на менш 50 пр. членаў саюзаў. Побач з гэтым дадзена ўстаноўка ўсім саюзам, каб у час 2-х тыдзёвіна ашчаднасьці ўцягнуць 15 проц. месячнага заработку членаў саюзаў.

Пастаноўлена скарыстаць усе выезды працаўнікоў ЦСПСБ і ЦП саюзаў у акругі для праверкі ўдзелу прафсаюзаў у 2-х тыдзёвіну ашчаднасьці і прынцыпы на месцах мер да ўзмацненьня кампаніі.

Для больш пасьпяховага праведзеньня двухтыдзёвіна ЦСПСБ лічыць неабходным, каб у часе выплаты зарплаты на буйных прадпрыемствах былі арганізаваны сталыя касы ашчаднасьці.

Усебеларускі зьезд калегій абаронцаў.

Гэтымі днямі закончыўся ўсебеларускі зьезд калегій абаронцаў. Зьезд абмеркаваў такія пытаньні, як падвышэньне кваліфікацыі найбольш адсталых членаў калегій, узмацненьне палітычнай працы сярод іх і інш. Прэзыдыуму калегій даручана распрацаваць пытаньне аб прававым палепшаньні члекаў калегій і аб УРАўненьні іх у правах з членамі прафсаюзаў.

У прэзыдыум калегій абрана 13 асоб: старшынёй—т. Слонім, намесьнікамі—т. т. Воскабойнікаў і Фрыдман, сэкратаром—т. Корсак.

Пленум БелАПП'а.

10-га сакавіка ў Доме Пісьменьнікаў распачаўся 1-ны пленум БелАПП'а.

Пленум працягнецца некалькі дзён.

Адчыніўся IУ пленум ЦСПСБ.

Учора в 3-й гадзіне дня адчыніўся IУ пленум Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў Беларусі.

Пленум абгаворыць вынікі калдагаворнай кампаніі, даклад ВСНГ Бел. аб выкананьні прамфінпляну, даклад Наркамгандлю і Белрабсаюзу аб рабочым забесьпячэньні і інш.

Райённыя зьезды саветаў.

9 сак. в Менску выехалі на адчыненьне райённых зьездаў саветаў прадстаўнікі Менскага акрыканкому. 10 сак. райённыя зьезды адчыніліся ў Чэрвенскім, Бягомльскім і Самахвалавіцкім раёнах. На Бягомльскім раённым зьезьдзе саветаў будзе абгаворан даклад ураду, а ў іншых—справаздачна акрыканкому.

БДТ 2 — у Магілеве.

Учора ў Магілеве ў Дзяржтэатры імя Ігнатоўскага пастаноўкаю п'есы Лаўрэнева «Разлом» распачаў свае трохмесячныя гастролі на Магілеўшчыне БДТ2.

Пастаноўкі тэатру будуць адбывацца 3, найбольш 4 разы на тыдзень.

Зараз адбываюцца спробы 2-х новых п'ес, якія будуць пастаўлены ў канцы сэзону.

У шэрагу п'ес, якія пойдуць на магілеўскай сцэне, маюцца: «Разлом», «Каля тэрасы», „Рэйкі гудуць", «На правесьні», «Калі пяюць пеўні» і інш.

Тэатр будзе імкнуцца як мага дасканальней абслужыць арганізаванага гледача—праз саюзныя арганізацыі і ўстановы.

Першым, пакуль што, у гэтым напрамку, ідзе прафсаюз працасьветы, закупіўшы ўжо спэктакль «Каля тэрасы» ў бліжэйшай яго пастаноўцы.

Трэба спадзявацца, што і другія саюзы не падкачаюць.

Яўрэйскі дзярж. хор.

10-га сакавіка ў клюбе Леніна адбыўся адчыненьне яўрэйскага дзяржаўнага хору-студыі. На адчыненьне хору былі запрошаны прадстаўнікі партыйных, савецкіх, прафсаюзных арганізацый і амэрыканскай рабочай дэлегацыі.

Хор складаецца з 60 асоб, пераважна з рабочай моладзі, пад кіраўніцтвам т. Палонскага.

Сваё першае выступленьне хор пачаў выкананьнем шэрагу народных і рэвалюцыйных сьпеваў, якія вельмі прыхільна былі сустрэтыя публікай.

Аб значэньні арганізацыі хору выступалі в прамовамі т. т. Ошэраў, Гольшток, Камінскі і віцэ-прэзыдэнт амэрыканскай рабочай дэлегацыі т. Рэдзі

У Мазырскай акрузе знайдзены залежы фарбы.

Каля в. Бярозаўка, Юравіцкага р., Мазырскай акр. ёсьць залежы каштоўных фарбаў--вохры і умбры. Штогод з гэтага месцавывозяць да 20-ці вазоў фарбы.

Мазырскае краязнаўчае т-ва робіць захады да вывучэньня гэтых залежаў.

Спаборніцтвам зацікавілі моладзь.

Сьвяткуючы XI гадавіну Чырвонае армії, Чавускі райсавет ТДА-Авіахіму з'арганізаваў спаборніцтва камсамольскае ячэйкі гораду па разборцы і зборцы вінтоўкі, затвору і карыстаньню процівагазам.

У спаборніцтве прымалі ўдзел камсамольская ячэйкі гор. Чавусы і асобныя камсамольцы. На спаборніцтве першае месца заняла прафмольная камсамольская ячэйка, другое месца савецкая ячэйка і трэцяе прафсаюзная. Спаборніцтва зацікавіла ўсю моладзь і выклікала жаданьне займацца вайсковай справай.

Выканаьне экспартных плянаў пад пагрозаю.

Гісторыя з загатоўкамі паўтараецца, толькі з некаторым спазьненьнем: летась пачалі біць трывогу ў сьнежні-студзені; сёлета яе рэгулюючыя плянавыя органы замятусіліся, занепакоіліся ў сакавіку.

А вядуць загатоўкі слаба амаль усе арганізацыі: Лесбел, Дзяржгандаль, кааперацыя і інш.

Лесбел будаваў «паветраныя замкі», ён даводзіў, што Белдзяржгандалю няма чаго рабіць на лясным рынку, і частку загатовак апошняга заваяваў сабе, а цяпер, апусьціўшы галаву, гаворыць:

— Не магу выканаць такі «вялікі» плян, не разьлічыў сваіх «сіл»...

Белдзяржгандаль у гэтым годзе значна скарапіўся, асноўныя віды тавару загатаваны мала, экспартны плян ня выканан на 50 проц., а між тым, трэці квартал ужо блізка...

У чым жа справа, чым растлумачыць такі значны процант недавыкананьня экспартных плянаў?

Трэба в усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што адна з асноўных прычын невыкананьня пляну тое, што нашы кіраўнікі сядзелі ў габінетах і пісалі красамоўныя абежнікі аб узмацненьні загатовак, а жылі ніколі ня цікавіліся ходам гэтых загатовак. Камандыроўкі, зьвязаныя з узмацненьнем загатовак, праўда, былі, але яны не дасягалі месц, дзе ідзе непасрэдная загатоўка.

Ужо ў сьнежні-студзені было відаць, што загатоўкі ідуць ня тым тэмпам, як гэта трэба, і замест таго, каб тут-жа прыняць самыя энэргічныя, самыя цьвёрдыя меры, займаліся перапіскаю, абежнікамі, выгаварамі, напярэданьнямі... А ў нізох—загатоўцы чакалі, пакуль сяляне ці іншыя здатчыкі прыедуць самі на пункт і скажуць: «Зрабіце ласку—возьміце ў мяне пудзік лёну»...

Зразумела, што такі падыход да загатоўкі не дае станоўчых вынікаў.

Белсельсаюз на адной нарадзе ня мог адказаць, колькі ён экспартаваў.

Нельга абмінуць яшчэ аднаго моманту, які ўплываў на скарачэньне загатовак: гэта тое, што некаторыя арганізацыі знаходзяцца ў «прывілейным» становішчы, у некаторых ёсьць у дастатковай колькасьці прамтавары, які тут-жа мяняюць на сыравіну.

Ёсьць і яшчэ шмат прычын. Але ўся бяда ў тым, што аб гэтым пачалі крычаць у сакавіку, калі трэба было загаварыць аб гэтым у сьнежні, калі шмат што можна было-б выправіць, зьмяніць, а цяпер справа горш, бо сэзон асноўных экспартных відаў тавару ўжо падыходзіць к канцу.

У выніку ўсяго гэтага экспартны плян БССР пад пагрозаю, чаго дапусьціць нельга. Неабходна знайсьці выхад з становішча; яшчэ можна ў сакавіку і красавіку шмат дагнаць, а для гэтага неадкладна трэба ўсе сілы кінуць на загатоўчы фронт, зьнішчыць канкурэнцыю, якая і да гэтага часу так шкодна ўплывае на загатоўцаў.

Трэба выканаць экспартны плян, чаго-б гэта ні каштавала; а для гэтага патрэбна самая напружаная і інтэнсыўная праца ўсіх загатоўчых арганізацый, якім пара ўжо зразумець усю важнасьць гэтага пытаньня, пара спыніць асабістыя супярэчнасьці і канкурэнцыю.

ЛЕЎСКІ.

Торф—на замену дрывянога апалу.

З кожным годам узрастае спажываньне торфу на апал замест дроў. Так, у 1924-25 г. было здабыта 36.000 тон торфу, у 1925-26 г.—69.900 тон, у 1927-28 г.—206.000 тон, а ў 1928-29 г. мяркуецца здабыць 388.000 тон. Пачынаючы з 1924 г., дзякуючы ўжываньню торфу, было захавана 3.263 гэкт. лясного пляцу. У 1927-28 г. працавала на торфаздабываньні 29 машын у 39 арцелях, а ў 1928-29 г. мае працаваць ужо 50 машын (у 70-ці арцелях).

Адначасна з гэтым пачынае павялічвацца здабываньне торфу на падсьціл скаціне і на ўгнаеньне. У 1926-27 г. было здабыта 291 тона падсьцілачнага торфу, а ў 1927-28 г.—1856 тон. У 1926-27 г. было здабыта на ўгнаеньне 1246 куб. мэтраў, а 1927-28 г.—2842 куб. мэтр. торфу.

Зразумела, пры гэткім росьце торфаздабываньня расьце і сетка таварыстваў па здабываньні торфу. У канцы 1926-27 г. было 137 т-ваў, у канцы 1927-28 г.—271, а да канца 1928-29 г. будзе ўсяго 382 т-вы.

Торф ужывае на апал ня толькі насельніцтва, але паступова гэты беларускі [illegible] пачынае адыгрываць значнае месца і ў палівы прамысловасьці і ў электрыфікацыі. Закончана дасьледаньне балотнага масыву Грэбнева, Магілеўскай акругі, які будзе эксплёатаваць фабрыка-штучнага шоўку ў Магілеве. Закончана дасьледаваньне часткі Судабольскага масыву ў 3500 гэкт., прызначанага для абслугоўваньня торфам Менскай электрастанцыі. Зараз вядзецца дасьледаваньне другога вучастку, гэтага-ж масыву. Распачата дасьледаваньне часткі Абльскіх балот, Полацкай акр., у райёне якіх мяркуецца пабудова заводу на вырабу ізаляцыйных пліт. Таксама дасьледавана частка Кабылянскага масыву, Гомельскай акругі, эксплёатацыя якога павінна адыграць вялікую ролю ў электрыфікацыі усіх прадпрыемстваў Гомелю.

Зразумела, для такой вялікай працы ў галіне разгортваньня торфаздабываньня трэба яшчэ належны штат працаўнікоў. З кожным годам кадры спэцыялістаў па торфу павялічваюцца. Спэцыяльныя курсы для торфамайстроў выпусьцілі летась каля 45 чал. Сёлета прадбачыцца арганізацыя такіх курсаў на 200 чал.

„Сав. Беларусь" дапамагла.

УДАВЕ ТУЖЫКАВАЙ ЛЕС АДПУШЧАН.

У допісе „Узорчык валакіты і бюрократызму", зьмешчаным у № 42 за 22-2 г. г., паведамлялася наступнае: Удава Тужыкава зьвярнулася ў Рагачоўскае лясьніцтва, каб атрымаць дармова лес на хату. Лясьніцтва накіроўвае ў сельсавет, а сельсавет—назад. Аб гэтым была зьмешчана заметка ў № 287 н-газэты. На падставе заметкі старшыня СНК т. Галадзед даў распараджэньне адпусьціць гр-ці Тужыкавай лес. Пракурор Рэспублікі в свайго боку правяве акруговай пракуратуры прыцягнуць вінаватых у цяганіне да адказнасьці. Ня глядзячы на тое, што ўсе заварушыліся, гр-ка Тужыкава ўсё-ж лесу не атрымала, і ўсе інстанцыі, пачынаючы з акруговага мастабу, абмяжоўваліся звычайнай перапіскай і адпіскай.

На гэты допіс Наркамзем паведамляе, што гр-ка Тужыкава ўжо атрымала дармова лесу на 75 рублёў. Вінаватыя ў несвоечасовым выкананьні правановы СНК і АВК прыцягнуты да адказнасьці, а справа аб абвінавачаньні аб'яздчыка Рагачоўскага лясьніцтва Калмачонка і старшыні Курганоўскага сельсавету Сілкова ў валакіце ўжо перададзена ў нарсуд.

ХУЛІГАНСТВА БУДЗЕ СПЫНЕНА.

У допісе «Сьмяцьце хуліганаў», зьмешчаным у № 24 ад 1-2 г. г., паведамлялася аб хуліганскіх нападаньнях вядомага хулігана Рапапорта. Факты пацьвердзіліся; справа аб Рапапорце накіравана ў Нарсуд 2 го вучастку, Менскае акругі.

СУД

КІРМАШОВЫЯ ХУЛІГАНЫ І АНТЫСЭМІТЫ.

Вёска Любча знаходзіцца ў 2 вярстах ад м. Зембіна. Любчанскія хуліганы—Фёдар Шубараў, Макар Вашкевіч і Васіль Зімовіч кожны кірмашовы дзень наведвалі Зембін. Мэта іх заўсёды была адна: выпіць, пахуліганіць, напужаць сялян, зайсьці да якога-небудзь прыватнага гандляра—начапіць на яго „холаду" і атрымаць на выпіўку.

2 сьнежня 1928 году над вечар Шубараў, Вашкевіч і Зімовіч над «мухай» зьявіліся ў Зембін захапіўшы з сабой сталовыя нажы. У піўной Мэндаля Харыка хуліганы папрасілі піва, якое выпілі і, не заплаціўшы грошай і назваўшы Харыка „жыдоўскай мордай", накіраваліся ў заежджы дом Поляка, дзе сталі разганяць заежджых і ламаць мэблю.

Калі на крык сям'і Поляка ў заежджы дом прыйшоў Лейзэр Шыфрын і пачаў прасіць хуліганаў супакоіцца, апошнія з крыкамі—„бей жидов, спасай Россию" накінуліся на Шыфрына і зьбілі яго.

З напуганых хуліганаў у мястэчку гандляры пачалі зачыняць крамы і хаваць, куды хто, але Шубараў, Вашкевіч і Зімовіч ня спынялі хуліганства.

Толькі пры дапамозе пагранічнікаў зембінскага пагранатрыяду хуліганы былі затрыманы, але і пры затрыманьні Шубараў пагражаў аўрэям, якія дапамагалі пагранічнікам, расправай.

Менскі акружны суд, разглядзеўшы гэту справу, прыгаварыў: Шубарава Хведара, Вашкевіча Макара і Зімовіча Васіля за тры гады зьявоўленьня кожнага з пазбаўленьнем у правах на два гады і высылкай з Менскай акругі па адбыцьці пакаранньня на тры гады кожнага.

На амністыі ў адзнаку 10-годзьдзя існаваньня БССР Шубараву і Вашкевічу мера сацыяльнай абароны зьмешчана пакуль, да Зімовіча, які раней ужо судзіўся за хуліганства, амністыя не дастасавана.

Д. Ц.

БІБЛІАГРАФІЯ.

НАШ КРАЙ. Штомесячнік ЦБК пры Беларускай Акадэміі Навук № 1 (40) студзень 1929 г. стар. 72, цана 50 кап.

У гэтым нумары рэдакцыя падводзіць некаторае падсумаваньне ў разьвіцьці краязнаўчага руху на Беларусі.

З 72 старонак разглядаемага нумару толькі 25 адведзены артыкулам, дзе высьвятляюцца практычныя пытаньні краязнаўства, а астатнія 47 старонак прыходзяцца на інфармацыю і артыкулы па гісторыі краязнаўства.

Да апошніх трэба аднесьці арт. М. Касьпяровіча «Дарэвалюцыйныя сельска-гаспадарчыя гурткі і краязнаўства», арт. Я. Марука «Краязнаўчая праца студэнтаў» (студэнцкае навукова-дасьледчае т-ва краязнаўства беларускага Дзяржаўнага Унів-ту), потым арт. В. Дзьмітрыева «Дзесяць гадоў этнаграфічнай працы ў Смаленскай губ. (1917-27 г. г.)» і нарэшце справаздачу аб II усебеларускай краязнаўчай канфэрэнцыі (якая адбылася 7—12 студзеня 1929 г.), заняўшай увесь разьдзел хронікі (стар. 49—72).

Пакідана, каб рэдакцыя штогод у № 1 падводзіла падагульненьні працы за прашэдшы год ува ўсіх галінах краязнаўства.

Зварачваюць на сябе ўвагу арт. М. Касьпяровіча і Які Марука.

Справаздача аб II ўсебеларускай краязнаўчай канфэрэнцыі паказвае, што, нягледзячы на некаторыя недахопы, краязнаўчая праца на Беларусі разьвіваецца ў сугле правільна і дасягнула ўжо вял. вынікаў.

Што-ж тычыцца іншых артыкулаў, якія шчакных у гэтым нумары, дык з іх яй больш каштоўнымі зьяўляюцца арт. М. Макарэвіча «Мэтэорологічныя ўмовы і іх уплыў на сельскую гаспадарку ў межах БССР за жнівень 1927 г.—жнівень 1928 г.», артыкул П. Астроўскага «Кальніі баброў на рэчцы Сож» і, нарэшце, арт. Ус. Міцкіцкага—„Дванаццаць дзён краязнаўчага вандраваньня".

Артыкул гэты яшчэ ня скончаны, і тое, што ёсьць у ім, мае значную каштоўнасьць.

Канчатак арт. І. Г. Мірскага «Матэрыялы да вывучэньня рабочага і сялянскага руху ў Магілёўшчыне ў перыяд 1903-1919 году» ня мае вялікае навуковае каштоўнасьці з тае прычыны, што шмат што з пададзенага аўтарам было ўжо видома.

Выдадзен нумер добра. Н. Фін-н.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
АЎТОРАК, 12-га САКАВІКА
СІМФАНІЧНЫ КАНЦЭРТ
Білеты ў касе тэатру і рабочай касе
Пачатак а 8½ гадзіне ўвечары.

СЕРАДА 13 САКАВІКА ДЛЯ ЛКСМБ
БАЛЕТНЫ ВЕЧАР
Пачатак а 8 гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».
З аўторка 12 сакавіка
ЗАМЕЖНЫ МАСТАЦКІ БАЯВІК
„РЭЙНСКІ БУНТАР"
У 8 частках.
Пачатак а 7 гадзіне.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».
З аўторка 12 сакавіка
Мастацкі гістарычны баявік
„КАХАНЬНЕ НАПОЛЕОНА"
У 8 ЧАСТКАХ.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ
„ДРУГОЕ ЖЫЦЬЦЁ"
У 8 ЧАСТКАХ ПАЧАТАК А 7 ГАДЗІНЕ.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР».
„КАПІТАНСКАЯ ДАЧКА"
Пачатак а 3 і 5 гадзіне
ЦАНА БІЛЕТУ 10 КАП.

Грамадзянка Фёкла Арцёмава ШПУНТ якая паходзіць з грамадзян гор. Быхава, Магілёўскае акругі, і жыве у гор. Быхаве па Музыкальнаму завулку ў д. № 7 зьмяняе імя „Фёкла" на імя „Люся".

Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены імя—просяць паведаміць аб гэтым Магілёўскі Акруговы ЗАГС, паказаўшы свае прозьвішча, імя, імя па бацьку і месца пражываньня.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Квіт Хазчасьці НКФ. ад 13-II 28 г. за № 132 на 15 руб., 2) квіт. ад 3-III—28 г. за № 360 на 15 р. аб узносе квартэрнай платы ў дэпозыт нарсуда I вуч. Менакругі ў карысьць Жакту № 16 на імя Пашкоўскага Б. кв. № 630.

— Камісійная кніжка Жданова П. А., выд. Мазырскім Ваенкаматам.

— Лекавая кніжка Сеняруцкай Л. Я., выд. Магілёўскай страхкасай, кв. № 450.

Дзяржаўныя працоўныя касы ашчаднасьці

ПРАВОДЗЯЦЬ

ДВУХТЫДНЁВІК АШЧАДНАСЬЦІ.

Зьяўляючыся ўкладчыкам касы ашчаднасьці, рабочы, селянін і ўсякі працоўны робіць карысную справу для сябе і ўзмацняе савецкую дзяржаву.

КАСА АШЧАДНАСЬЦІ—плаціць ад 8 да 9 проц. у год.

КАСА АШЧАДНАСЬЦІ—у вялікай тайне захоўвае прозьвішча ўкладчыка і яго зьберажэньні.

КАСА АШЧАДНАСЬЦІ—дапамагае па дробязях рабіць зьберажэньні для набыцьця патрэбнай рэчы ў гаспадарцы і ва ўласным карыстаньні.

Укладчык можа ва ўсякі час узяць свае грошы па частках, ці цалкам, а таксама перадае іх, каму пажадае.

У КАСЕ АШЧАДНАСЬЦІ ўкладчык можа

— Перавесьці свой уклад ці частку ў іншую касу ашчаднасьці.

— Набыць ці прадаць аблігацыю дзяржаўнай пазыкі.

— Атрымаць пазыку пад аблігацыю дзяржаўн. пазыкі.

— Набыць сэртыфікат-каштоўную паперу, якая дае вялікую выгаду (12 проц. гадавых).

КАСЫ АШЧАДНАСЬЦІ ёсьць ва ўсіх гарадох: самастойныя—пры фінаддзелах, аддзяленьнях Дзяржаўнага Банку, паштовых установах і буйных прадпрыемствах.

У СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЬЦЯХ КАСЫ АШЧАДНАСЬЦІ ёсьць пры ўсіх паштовых аддзяленьнях і агенцтвах і на чыгуначных станцыях, прыём і выдачу ўкладаў робяць ксама пісьманосцы.

РАБОЧЫЯ, СЯЛЯНЕ І СЛУЖАЧЫЯ—
УСЕ Ў ШЭРАГІ ЎКЛАДЧЫКАЎ КАС АШЧАДНАСЬЦІ!

М. КАШЭН—камуністычны дэпутат у французкай палаце.
К. ВАРАШЫЛАЎ—Народны Камісар па ваенных і марскіх справах.
М. ЛІТВІНАЎ—Нам. Наркома па чужаземных справах.

ЗАМЕРЫ БУРЖУАЗІІ СУПРОЦЬ СССР І МІРНАЯ ПАЛІТЫКА САВЕТАЎ.

ЗЬМЕСТ:
Замеры французскіх імпэрыялістаў супроць СССР.
Абарона краіны і задачы рабселькораў.
За мір, за разброеньне, супроць падрыхтоўкі новай вайны.

Стр. 109. Цана 10 кап.

Галоўлітбел 595

Менск. дзяржаўная друкарня.